WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ВЕРАСНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 182
(27046)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Пытанне міністру

УСЁ АБ АДНАРАЗОВАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОЗЕ І НЕ ТОЛЬКІ

Фота БЕЛТА.

...Бацька-пенсіянер пайшоў з жыцця 15 верасня гэтага года — ці можа сын атрымаць належную яму па рашэнні кіраўніка дзяржавы матэрыяльную дапамогу ў памеры 500 тысяч рублёў?.. Альбо іншая сітуацыя: непрацуючы пенсіянер атрымлівае пенсію ад Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — ці мае ён права на атрыманне матэрыяльнай дапамогі для закупкі сельгаспрадукцыі?..

Пытанняў, якія на працягу гадзіны ўчора падчас прамой тэлефоннай лініі грамадзяне задавалі **міністру працы і сацыяльнай абароны Марыяне ШЧОТКІНАЙ**, было шмат — каля шасці дзясяткаў. Мы ж спынімся на найбольш цікавых з іх. Найчасцей людзі непакоіліся аб выплаце аднаразовай матэрыяльнай дапамогі, прадугледжанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня № 417.

Адносна першай згаданай вышэй сітуацыі (са смерцю бацькі), міністр патлумачыла, што дапамога належыць самому пенсіянеру і наследаванню роднымі ў выпадку яго смерці не падлягае. У другой сітуацыі (дзе чалавек атрымлівае расійскую і беларускую пенсіі) таксама не трэба разлічваць на атрыманне матдапамогі, бо палажэнні Указа не распаўсюджваюцца на атрымальнікаў пенсій з іншых дзяржаў.

А вось **пенсіянерцы, якая ўладкавалася на працу 5 верасня**, дапамога будзе выплачана, паколькі яна (дапамога) выплачваецца атрымальнікам пенсіі, якія на 1 верасня 2011 года не з'яўляліся індывідуальнымі прадпрымальнікамі і не ажыццяўлялі працоўную дзейнасць.

Менш радасным быў адказ на пытанне студэнткі аднаго са сталічных універсітэтаў. **Дзяўчына атрымлівае пенсію з нагоды страты карміцеля, вучыцца на дзённай форме ў БДУ. На перыяд летніх канікул (да 5 верасня) працавала па дагаворы падраду ў камерцыйнай арганізацыі. У мясцовых органах сацыяльнай абароны ёй сказалі, што на аднаразовую матэрыяльную дапамогу яна разлічваць не можа. Чаму?**

Насамрэч, кажа Марыяна Шчоткіна, права на аднаразовую матэрыяльную дапамогу маюць атрымальнікі пенсіі, якія на 1 верасня 2011 года не ажыццяўлялі працоўную дзейнасць на падставе працоўных дагавораў, грамадзянска-прававых дагавораў, прадметам якіх з'яўляюцца выкананне работ, аказанне паслуг і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, альбо на аснове членства ці ўдзелу ў юрыдычных асобах любых арганізацыйна-прававых формаў. Такім чынам, паколькі на 1 верасня студэнтка працавала, падстаў для выплаты ёй дапамогі, сапраўды, няма. Аднак міністр звярнула ўвагу на тое, што Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 417, які прадугледжвае выплату матэрыяльнай дапамогі, рэкамендавана кіраўнікам арганізацый, на работнікаў якіх не распаўсюджваецца дзеянне гэтага Указа, выплаціць матэрыяльную дапамогу сваім працаўнікам, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў арганізацый.

Дарэчы, грамадзяне пыталіся, **якія арганізацыі адносяцца да тых, што атрымліваюць субсідыі, і чые работнікі прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый?**

Марыяна Акіндзінаўна растлумачыла, што ў адпаведнасці з пералікам тыпаў арганізацый, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2011 г. № 4, **да арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі,** работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый, **адносяцца:** тэатральна-відовішчныя арганізацыі, паркі культуры і адпачынку, заапаркі, рэдакцыі перыядычных выданняў, арганізацыі тэлебачання і радыёвяшчання, арганізацыі кінематаграфіі, якія ажыццяўляюць пракат і паказ фільмаў.

Далей да міністра звярнулася **адзінокая мама, якая мае дваіх дзяцей 2005-га і 2011-га гадоў нараджэння, прычым старэйшы сын — інвалід. На яго жанчына атрымлівае сацыяльную пенсію і дапамогу па яго доглядзе, а яшчэ — дапамогу па доглядзе малодшага дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў. Жанчына цікавіцца, у якім памеры ёй будзе выплачана прадугледжаная Указам № 417 дапамога?**

Марыяна Акіндзінаўна патлумачыла, што на дапамогу мае права сама жанчына як атрымальнік дапамогі па доглядзе (па адной з падстаў) і яе дзіця-інвалід як атрымальнік пенсіі.

@ @ @

У сям'і выхоўваецца недзеяздольны інвалід 1 групы. Яго законны прадстаўнік — маці — атрымлівае сацыяльную пенсію; бацька не працуе, атрымлівае дапамогу па доглядзе інваліда 1 групы. Каму будзе выплачана аднаразовая дапамога?

У такой сітуацыі матэрыяльная дапамога паложана бацьку як атрымальніку дапамогі па доглядзе інваліда 1 групы і самому інваліду 1 групы — атрымальніку пенсіі. У сувязі з тым, што інвалід 1 групы з'яўляецца недзеяздольным, належная яму матэрыяльная дапамога будзе выплачана яго законнаму прадстаўніку — маці.

@ @ @

З улікам імклівага росту цэн на ўсе спажывецкія тавары і паслугі пенсіі не хапае, прызналася адна з пенсіянерак. Прыходзіцца падзарабляць, але пры гэтым губляецца частка пенсіі. Хіба справядліва адымаць частку зароблена пенсіі? Ці ёсць магчымасць адмяніць абмежаванні на выплату пенсій працуючым пенсіянерам?

— Абмежаванне выплаты пенсіі ў перыяд работы — мера неабходная, яна дазваляе падтрымліваць больш высокі ўзровень пенсій тым, хто ўжо пакінуў працу, — патлумачыла міністр. — Мяркую, вы пагодзіцеся, што для пенсіянераў статус работніка часовы. Рана ці позна, але пенсія становіцца адзінай крыніцай сродкаў існавання. І для таго, каб забяспечыць больш істотныя выплаты непрацуючым, пенсіі, якія выплачваюцца работнікам, абмяжоўваюцца. Звяртаю ўвагу, што да нас часта паступаюць звароты ад непрацуючых пенсіянераў з прапановай не выплачваць пенсіі тым пенсіянерам, якія працуюць. Таму да вырашэння гэтага пытання неабходна падыходзіць вельмі ўважана.

@ @ @

«Чула аб змяненні памераў дапамог. Растлумачце, у якім памеры нам выплацяць дапамогу, калі нараджэнне двайнятак чакаецца да канца верасня або ў пачатку кастрычніка?» — наступнае пытанне.

— Сапраўды, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 2011 года № 416 памер дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці павялічаны ўдвая. Указ уступае ў сілу з 1 кастрычніка. Днём ўзнікнення права на матэрыяльную дапамогу з'яўляецца дзень нараджэння дзіцяці. Такім чынам, у выпадку нараджэння дзяцей да 30 верасня ўключна дзяржаўная дапамога будзе прызначана ў наступных памерах: пры нараджэнні першага дзіцяці — у памеры пяціразовай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму (2.211.800 рублёў); пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — у памеры сяміразовай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму (3.096.520 рублёў). Пры гэтым, калі ў сям'і чакаюцца першынцы, то пры нараджэнні двайнят памер дапамогі вызначаецца дыферэнцыравана: на першага з дваіх выплачваецца пяць бюджэтаў пражытачнага мінімуму, на другога — сем бюджэтаў пражытачнага мінімуму. Калі ў сям'і ўжо ёсць дзеці, то дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці будзе выплачана ў памеры сямі бюджэтаў пражытачнага мінімуму на кожнага з нованароджаных.

СТАР. 2

СОНЦАСТАЯННЕ Ў ГОРАДЗЕ СОНЦА

Гэтую вераснёвую пару, калі даўжыня дня роўная даўжыні ночы, спрадвеку называюць восеньскім сонцастаяннем, альбо раўнадзенствам. Учора пачаўся адлік часу астранамічнай восені, і сонейка павярнула на зіму.

Але да сапраўднай зімы далёка. Наперадзе яшчэ цёплыя дзянькі «бабінага лета», калі можна парадавацца чырвона-залатому колеру лістоты дрэў і нечаканай сустрэчы ў полі з запозненымі рамонкамі.

Горадам сонца можна назваць старажытны надгарынскі Давыд-Гарадок, дзе, згодна з традыцыяй, франтоны кожнага дома ўпрыгожваюцца сонейкамі. Ці то ў выяве ўзыходу, ці цалкам прамяністага, паўдзённага. Гаспадары не шкадуюць часу і фарбы *(на фотаздымку)*, каб гэтыя «сонейкі» зіхацелі і кідаліся ў вочы, незалежна ад таго, прыйшла ўжо да нас (або не) астранамічная восень.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

(Працяг тэмы на 2-й стар.)

РАЎНАВАЖНЫ КУРС — У КАСТРЫЧНІКУ

Як ужо паведамляла «Звязда», віцэ-прэм'ер Сяргей Румас заявіў, што плануецца павышэнне з 1 кастрычніка 2011 года тарыфнай стаўкі першага разраду. Аднак ён падзяліўся не толькі гэтай навіной. Ён расказаў аб некаторых планах урада на будучыню: «Думаю, падаткаплацежнікам будзе цікава ведаць, што ў межах удасканалення падатковай сістэмы на 2012 год плануецца змяншэнне стаўкі падатку на прыбытак. Канкрэтны памер пакуль вылічваецца, але тое, што памяншэнне будзе, не выклікае сумненняў», — сказаў намеснік прэм'ер-міністра.

Размова таксама ішла аб індэксацыях. «Павелічэнне рознічных цэн з'яўляецца вымушаным захадам, — стаў тлумачыць Сяргей Румас. — У гэтых умовах урад ставіць перад сабой задачу не дапусціць зніжэння рэальных даходаў насельніцтва. Для гэтага з бюджэту ажыццяўляецца выплата індэксацый. За жнівень яна будзе складаць 244 тысячы рублёў». Працягваючы тэму росту цэн, чыноўнік выказаў сваё асабістае меркаванне наконт выраўноўвання цэн з Расіяй: «Я прытрымліваюся таго пункту гледжання, што поўнага выраўноўвання цэн з Расійскай Федэрацыяй не павінна быць».

Сярод іншага, намеснік прэм'ер-міністра закрануў тэму знешнегандлёвага сальда. «У ліпені сальда было станоўчым — плюс 380 млн долараў ЗША, — сказаў ён. — Апошні раз такое было ў 2005 годзе. Мяркуецца, што станоўчая дынаміка ў знешнім гандлі захаваецца і ў жніўні, — гэта можа быць плюс 200 млн долараў ЗША».

Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Тарас Надольны расказаў аб стане спраў на валютным сегменце рынку:

— За першыя шэсць дзён функцыянавання дадатковай сесіі аб'ём таргоў вырас прыкладна ў 9 разоў: з 8 млн долараў да 68 млн у дзень, — заявіў намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

Пасля прадстаўнік галоўнага банка краіны запэўніў усіх, што Нацыянальны банк на таргах дадатковай сесіі валютна-фондавай біржы не праводзіў ніякіх інтэрвенцый на продаж сваіх рэзерваў для стымулявання прапановы, а, наадварот, ажыццяўляў апошнія тры дні інтэрвенцыі на куплю валюты з мэтай таго, каб «узмацненне беларускага рубля адбывалася паступова ў межах тых тэрмінаў, якія былі абмеркаваны з урадам».

Тарас Надольны падкрэсліў, што аб'ём прапановы на валютным рынку з боку насельніцтва значна павялічыўся, і сёння ён перавышае попыт прыкладна ў дзесяць разоў. Дарэчы, паводле папярэдніх звестак за 14—19 верасня, чысты продаж насельніцтвам замежнай валюты склаў каля 108 млн долараў ЗША.

Аднак прадстаўнік Нацбанка ўпэўнены, што пакуль «ніхто не дасць дакладнага значэння раўнаважнага курсу, да якога мы ідзём». На яго думку, дакладна можна сказаць толькі тое, што раўнаважны курс знаходзіцца дзесьці паміж афіцыйным і рынкавым. А тэрмін выхаду на адзіны курс агучыў Сяргей Румас: «Я думаю, што калі ўсё пойдзе па плане, то ў кастрычніку мы зможам пакончыць са шматлікасцю курсаў».

Асаблівасцямі палітыкі Нацбанка пры новым курсе Надольны таксама падзяліўся: «Пры новым курсе рыначныя фактары ўсё роўна будуць прэваліраваць. Нацбанк будзе толькі маніторыць сітуацыю і не дапускаць залішняга ўзмацнення альбо паслаблення беларускага рубля».

Не засталася незакранутым і вельмі цяжкае для многіх людзей пытанне росту ставак па крэдытах. «Зразумела, высокія стаўкі па дэпазітах з'яўляюцца сур'ёзнай нагрузкай на фізічных асоб, якія ўзялі крэдыты, — канстатаваў Тарас Надольны. — Аднак Нацбанк праводзіць рэкамендацыйную палітыку ў дачыненні банкаў, каб яны ўсё ж такі гібка адносіліся да фарміравання працэнтных ставак па крэдытах для фізічных асоб. Шмат хто да гэтага прыслухоўваецца і фарміруе стаўку па крэдыце па сярэднім паміж былой і цяперашняй стаўкай узроўні».

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ АБМЕРКАВАЎ З АЛЯКСЕЕМ МІЛЕРАМ ЦЭНЫ НА ГАЗ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч сустрэўся ўчора са старшынёй праўлення ААТ «Газпрам» Аляксеем Мілерам.

Бакі працягнулі перагаворы па пытаннях фарміравання цэн на газ для Беларусі з 2012 года і тарыфаў на транспарціроўку газу па беларускай тэрыторыі. Падчас сустрэчы былі таксама закрануты некаторыя аспекты цэнаўтварэння на газ для Беларусі з 2015 года, калі Расія плануе выйсці на роўнадаходную цану для ўнутраных і знешніх спажыўцоў.

Асобную ўвагу Міхаіл Мясніковіч і Аляксей Мілер надалі абмеркаванню міжурадавага пагаднення аб умовах куплі-продажу акцыі і далейшай дзейнасці ААТ «Белтрансгаз». Цяпер названы праект пагаднення знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці. У жніўні гэтага года старшыня ўрада Расіі Уладзімір Пуцін паставіў задачу Міністэрству энергетыкі Расіі і ААТ «Газпрам» аператыўна выдзеліць паніжаючы інтэграцыйны каэфіцыент для цаны паставак расійскага газу ў Беларусь. Кантрактная цана на пастаўляемы ААТ «Газпрам» у Беларусь прыродны газ у трэцім квартале гэтага года складае з $279,16 за 1 тыс. куб.м. Пры захаванні цаны на нафту на бягучым узроўні цана на газ для Беларусі ў чацвёртым квартале 2011 года можа ўзрасці да $307 за 1 тыс. куб.м.

БЕЛТА.

Затрыманы непрацуючы мінчанін, які збіў выхаванцаў дзіцячага садка

Супрацоўнікамі міліцыі затрыманы раней судзімы за забойства жыхар сталіцы, які збіў выхаванцаў дзіцячага садка. Напярэдадні днём ён зайшоў на гульнявую пляцоўку дзіцячай дашкольнай установы № 26 і пачаў збіваць дзяцей 5—6 гадоў. Выхавальнікі не змаглі заступіцца за малых, бо зламыснік пагражаў ім пнеўматычнай зброяй. Адміністрацыя ўстановы, пачуўшы дзіцячыя крыкі і плач, выклікала міліцыю. Падчас затрымання хуліган аказаў супраціўленне супрацоўнікам праваахоўных органаў.

Затрыманы — жыхар сталіцы 1970 года нараджэння — знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Зараз у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа. За хуліганства і пагрозы выхавальнікам пнеўматычным пісталетам яму пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі.

Яўген АЛЕЙНІК, *«Мінск—Навіны».*

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ООО «Сервисэлектросетьстрой»

Здание ангара ЦСМ, инвентарный № 600/С-104846, общая площадь здания 526 кв.м, стоимостью 881 842 800 рублей, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, район д. Большой Тростенец.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества, что составляет 44 092 140 рублей.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 12.10.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Манюк Т.А., тел.-факс: 294 93 65, ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

КУРС ПАТРОХУ ЗНІЖАЕЦЦА

Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы долар патанneў на 60 рублёў, еўра — на 290, расійскі рубель — на 4. Паступовае зніжэнне курсаў асноўных валют працягваецца.

Пасля таго, як 20 верасня курсы знізіліся адносна рэзка і значна, наступныя два зніжэнні былі ізноў нязначнымі. Чаму так атрымалася, карэспандэнту «Звязды» патлумачыў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ:** «Проста мы меркавалі, што рынак сам возьме лішак прапановы на сябе падчас тых таргоў, калі моцна ўпаў курс (але ж нельга сказаць, што ён ужо так моцна ўпаў — гэта толькі адносна). Мы меркавалі ўсё ж такі, што Нацыянальнаму банку не трэба будзе ўмешвацца са сваім попытам, каб выключыць залішнюю прапанову. Аднак удзельнікі таргоў занялі стрыманую пазіцыю. І мы паглядзелі, што курс пачынае ўзмацняцца больш вялікімі тэмпамі, чым меркавалася, і самі выкупілі аб'ём лішняй прапановы. Магчыма, гэта трэба было зрабіць трошкі раней. Гэта ўсё звязана проста з тактыкай паводзін удзельнікаў таргоў».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

РЫНКАВЫЯ КУРСЫ НА 22 ВЕРАСНЯ:

Долар ЗША — 7950 беларускіх рублёў;
Еўра — 10660 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 249 беларускіх рублёў.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 22 ВЕРАСНЯ.

«Беларусбанк»:
Долар ЗША — 7200 і 7850; еўра — 9650 і 10600; расійскі рубель — 220 і 245.

«БПС-Банк»:
Долар ЗША — 7400 і 7800; еўра — 9935 і 10630; расійскі рубель — 231 і 248.

«Беларускі народны банк»:
Долар ЗША — 6900 і 8500; еўра — 9300 і 11600; расійскі рубель — 200 і 270.

Валянціна КАРАЛЁВА:

«У БЕЛАРУСІ ЗАХАВАЕЦЦА ДЗЕЙНЫ ПЕНСІЙНЫ ПАРОГ»

Пра гэта паведаміла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва на сумеснай online-канферэнцыі БЕЛТА і міністэрства.

«Павышэнне пенсійнага ўзросту — адна з дзейсных мер стабілізацыі пенсійных выдаткаў дзяржавы, гэта агульнавядома, — адзначыла намеснік міністра. — Што датычыцца перспектыў яе прымянення ў Беларусі, то арыенціры тут ужо неаднаразова агучваліся кіраўніком дзяржавы. Пакуль гэта магчыма, мы будзем захоўваць дзейны пенсійны парог». Адказваючы на пытанне рэспандэнта, яна прывяла звесткі аб пенсійным узросце ў краінах з высокім узроўнем жыцця. Так, у Нарвегіі, Даніі — 67 гадоў, у ЗША, Германіі (прынята рашэнне аб павелічэнні да 67 гадоў), у Швецыі, Фінляндыі — 65 гадоў, у Італіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі — 65/60 гадоў. Адна з апошніх краін, якая прыступіла да павышэння пенсійнага ўзросту, — Украіна. Што датычыцца паніжэння пенсійнага ўзросту, то гэтага сабе не могуць дазволіць нават багатыя краіны, дадала начальнік аддзела разв-

Фота БЕЛТА.

віцця пенсійнай сістэмы міністэрства Таццяна Пагонышава. «У Беларусі і без таго вельмі нізкі пенсійны парог», — канстатавала яна.

Пашырэнне пенсійных ільгот (у тым ліку мнагадзетным жанчынам) у Беларусі не плануецца. «У цэлым пенсійная сістэма не прызначаная для заахвочвання або ацэнкі заслуг перад грамадствам, — сказала Таццяна Пагонышава. — А мнагадзетныя мамы маюць патрэбу ў падтрымцы ў перыяд нараджэння і выхавання дзяцей. У старасці ж ім будзе на каго абаперціся».

Мяняць размеркаванне пенсійнай нагрузкі немэтазгодна

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі лічыць немэтазгодным змяняць размеркаванне пенсійнай нагрузкі паміж працадаўцамі і працаўнікамі. Паводле меркавання Валянціны Каралёвай, змены ў гэтай сферы могуць мець «вельмі негатыўныя наступствы як бюджэту Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, так і мясцовых бюджэтаў».

Адказваючы на пытанне аб тым, ці плануецца ў Беларусі зменшыць для наймальнікаў памер адлічэнняў на пенсійнае страхаванне (28% ад ФЗП), начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы міністэрства Таццяна Пагонышава прызнала, што гэты паказчык у нашай рэспубліцы «адзін з высокіх, але не самы высокі». У некаторых краінах з блізкімі дэмаграфічнымі параметрамі ён такі ж або яшчэ вышэйшы (ва Украіне — 33,2%).

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.09.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 515,00	1 чэшская крона	300,22
▼ 1 еўра	7 472,27	1 польскі злоты	1 680,28
1 латвійскі лат	10 519,79	▼ 1 расійскі рубель	172,83
1 літоўскі літ	2 161,30	1 украінская грыўня	689,38

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,9106
10 UAH	39,8957
10000 BYR	58,3802
EUR	43,2421

Мінсельгасхарч на 55—67 працэнтаў павысіў гранічныя мінімальныя цэны на прадукцыю жывёлагадоўлі для дзяржпатрэб

Мінсельгасхарч Беларусі па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі на 55—67 працэнтаў павысіў гранічныя мінімальныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю (жывёлагадоўлі), якая закупляецца для дзяржаўных патрэб. Такое рашэнне змешчана ў пастанове міністэрства № 58 ад 19 верасня 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў Мінсельгасхарчы.

У прыватнасці, мінімальныя закупачныя цэны на малако павялічаны на 55 працэнтаў. Так, новая цана на малако гатунку экстра складзе Br1,88 млн за тону, вышэйшага гатунку — Br1,62 млн, першага гатунку — Br1,495 млн.

Закупачныя цэны на свіней, згодна з дакументам, павялічваюцца на 62 працэнты. У прыватнасці, цана на свіней на забой будзе вар'іравацца ў залежнасці ад катэгорыі ад Br4,496 млн да Br9,537 млн за тону жывой вагі (без ПДВ), на свініну за тону забойнай вагі — ад Br7,744 млн да Br15,923 млн.

Акрамя таго, на 67 працэнтаў павышаюцца закупачныя цэны на буйную рагатую жывёлу. Так, цэны на БРЖ на забой складуць без ПДВ ад Br2,756 млн да Br33,049 млн за тону жывой вагі, за тону забойнай вагі — ад Br7,113 млн да Br61,615 млн.

Спецыялісты міністэрства, каментуючы прынятую пастанову, адзначылі, што гранічныя мінімальныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю жывёлагадоўлі даведзены да ўзроўню фактычна дзеючых цэн у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях. У іншых рэгіёнах яны былі ніжэйшыя, таму была неабходнасць выпрацаваць адзіны ўзровень цэн, што станоўча паўплывае на выкананне дзяржзаказу на гэту прадукцыю. Паводле слоў спецыялістаў, у іншых рэгіёнах, акрамя Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей, з увядзеннем у дзеянне гэтай пастановы Мінсельгасхарча, будуць павышаны дзеючыя цэны на малако ад 5 працэнтаў да 15 працэнтаў, БРЖ — ад 7 працэнтаў да 27 працэнтаў, свіней — ад 6 працэнтаў да 22 працэнтаў. Павышэнне гранічных мінімальных закупачных цэн на прадукцыю жывёлагадоўлі звязана таксама з неабходнасцю частковай кампенсацыі падаражэння сродкаў, якія затрачваюцца на яе вытворчасць.

Бягучае павышэнне закупачных цэн на малако і БРЖ — першае ў гэтым годзе, на свіней — другое.

Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Уладзімір УЛАХОВІЧ:

«Перазагрузка» па лініі Беларусь—ЕС магчымая. Больш за тое, яна ў інтарэсах абодвух бакоў

Гэтая думка належыць дырэктару Цэнтра міжнародных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзіміру Улаховічу. З ім аб цяперашнім стане адносін Мінска і Бруселя, перспектывах рэформы палітыкі суседства з ЕС гутарыць карэспандэнт «Звязды».

— Прэзідэнт пасля цырымоніі прыёму даверчых грамат паслоў ў размове з новым кіраўніком прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі выказаўся за «перазагрузку» беларуска-еўрапейскіх адносін на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемапавагі. Такая «перазагрузка» магчымая?

— Так. Больш за тое, яна ў інтарэсах абодвух бакоў. У ЕС добра разумеюць ролю і значэнне ўсходніх суседзяў. Для еўрапейцаў важна, каб па суседстве былі ўстойлівыя дзяржавы, надзейныя партнёры, якія б не стваралі нечаканых складанасцяў і праблем. У гэтым галоўны інтарэс і цікавасць еўрапейцаў, у прыватнасці, да нас, украінцаў, малдаван і г. д. Пры гэтым, на мой погляд, акрамя пытанняў грамадска-палітычнага развіцця, не менш важнымі, а можа быць, і больш важнымі, з'яўляюцца пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця суседніх краін. І гэтыя пытанні, мне здаецца, маглі бы быць у большай ступені прыярытэтным для еўрапейцаў, чым выключна палітычныя пытанні.

Думаю, што мы, як гаворыцца, «асуджаныя» на супрацоўніцтва, на тое, каб рэаадольваць рознагалоссі. Нагадаю, гісторыя адносін Беларусі і Еўрапейскага саюза налічвае ўжо дваццаць гадоў. Пасля двух апошніх пашырэнняў ЕС на ўсход наша краіна непазбежна апынулася ў зоне эканамічнага і геапалітычнага прыцягнення гэтай міждзяржаўнай структуры. Яе ўплыў Беларусь адчувае на сабе пастаянна. Таму патрэбна адэкватна сфарміраваная, узаемавыгадная і эфектыўная палітыка супрацоўніцтва. У Мінску і Еўропе сёння гэта добра разумеюць і вядучыя палітыкі, і эксперты, і простыя грамадзяне. Умацаванне еўрапейскага накірунку ўзаемадзеяння для незалежнай Беларусі вынікае з яе геаграфічнага становішча, нацыянальных інтарэсаў і прагматычнай логікі гаспадарчага жыцця.

— Уладзімір Яўгенавіч, якая стратэгія суседскага партнёрства адпавядала б рэальным патрэбам еўрапейцаў, незалежна ад таго, жывуць ці не жывуць яны ў краінах Еўрасаюза?

— Яна павінна абапірацца на больш эфектыўныя, сумяшчальныя паміж сабой і зразумелыя для ўсіх жыхароў еўрапейскага кантыненту прынцыпы і інструменты ўзаемадзеяння. Возьмем эканамічнае партнёрства. Надышоў час доўгатэрміновай і паўнавартаснай лібералізацыі гандлю паміж суседзямі. Гэта б у значнай ступені садзейнічала паглыбленню палітычнага дыялогу, у тым ліку ў рамках узаемных кансультацый на розных узроўнях, а таксама ў міжнародных арганізацыях. Ужо ёсць вельмі карысны досвед партнёрства прадстаўнікоў беларускіх органаў правасуддзя і ўнутраных спраў з калегамі з ЕС у вырашэнні праваахоўных, мытных і памежных пытанняў па сумесным процідзеянні нелегальнай міграцыі, гандлю людзьмі, кантрабандзе зброі і наркотыкаў і міжнароднай злачыннасці.

СТАР. 5

У люстэрку замежнай прэсы

Французскія СМІ «пахавалі» Еўропу і не вераць у светлы лёс еўра

Еўра яшчэ не мёртвы, а Еўропа, магчыма, ужо так, — лічыць галоўны рэдактар французскага часопіса Le Point Эрвэ Гаценьё, піша InoPressa.

«На жаль, не трэба быць нобелеўскім лаўрэатам па эканоміцы, каб зразумець, што банкруцтва не пагражае Грэцыі, а яна ўжо банкрут. Шматлікія каментатары робяць выгляд, што Дамінік Строс-Кан сказаў штосьці жудаснае, прапанаваўшы спісаць доўг Грэцыі, але насамрэч пра гэта кажуць (вядома, шэптам) усе палітычныя лідары па ўсёй Еўропе. Таму паўстае пытанне, ці можа Еўропа яшчэ зрабіць штосьці, каб перашкодзіць гэтаму працэсу, ці фінансавы крызіс ужо прадэманстраваў палітычнае банкруцтва», — адзначае Гаценьё.

Паводле меркавання публіцыста, цяжкае становішча Грэцыі выклікана сённяшнім расколам у Еўропе і папярэднім папушчальніцтвам, калі ўсім было наплявать, што Грэцыя «пагразае ў карумпаванай і бездакaзнай сістэме», і ніхто нават не спрабаваў змагацца з падатковымі парушэннямі і ценявой эканомікай. Паводле слоў журналіста, вялікая еўрапейская мара «ператварылася ў кашмар».

«На працягу многіх гадоў еўрапейскае будаўніцтва ўяўлялася грамадзянам як палітычны ідэал. Усе пярэчанні адкідаліся ў імя прагрэсу і аднадумства, а праціўнікі далейшага пашырэння ЕС зводзіліся ў ранг рэтраградаўабскурантыстаў, не здольных зразумець, што для іх лепш. У выніку ў імя аднадумства мы перайшлі ад адзінага рынку да адзінай валюты. Грамадская думка была пастаўлена перад фактам. А зараз ім тлумачаць, што катастрофу можна было прадбачыць. Дзіўна яшчэ, што гнеў жыхароў Грэцыі ці Іспаніі не прымае больш рэзкіх формаў», — мяркуе Гаценьё.

Выдатная еўрапейская ўтопія дыскрэдытаваная, канстатуе аўтар артыкула. «Еўрапейскія народы больш не жадаюць быць разам і ў радасці, і ў горы, — піша выданне. — Як у байцы «Страказа і Мурашка», немцы, фіны, галандцы (а таксама французы) адмаўляюцца плаціць за вар'яцтвы грэкаў. Як іх можна за гэта папракаць? Па логіцы, усё павінна было б скончыцца выхадам Грэцыі з еўразоны. Ці выхадам Германіі. У абодвух выпадках выратаванне еўра рызыкуе стаць першачарговай задачай у параўнанні з умацаваннем Еўропы. І рашэнне прымаць будуць зусім не грамадзяне».

Ёсць нагода? Ёсць пытанне!

ЯКІЯ АСАЦЫЯЦЫІ І ЎСПАМІНЫ Ў ВАС ВЫКЛІКАЕ ВОСЕНЬ?

22 верасня лічыцца мяжой паміж астранамічнымі летам і восенню. Сёлета нам пашанцавала: выцягваць цёплыя шапкі і шалікі пакуль не трэба. Але восень яшчэ паспее паказаць свой нораў. Цікава, а якія падзеі свайго жыцця беларусы атаясамліваюць з восенню?

Ганна ДРОЗД, студэнтка БДУ:

— У мяне дзень народзінаў увосень — гэта галоўная падзея. А ўвогуле асноўныя асацыяцыі: пах сырасці; кавярня, кава і джаз; і нават каханне.

Віталь РЫЖКОВІЧ, дызайнер:

— Я ад пэўнай пары года не надта залежу, калі пра настрой разважаць. Але ж восенню ў мяне заўжды пачынаюцца нейкія змены. Гадоў сем таму, калі быў яшчэ школьнікам, менавіта восенню вырашыў адрасціць доўгія валасы, за што на мяне вельмі сварыліся настаўнікі. Яшчэ, відаць, з гэтай парой я звязваю свой пераезд у Мінск. Паступіў вучыцца ва ўніверсітэт, а заняткі ж у верасні пачынаюцца.

Вольга ХАМУК, бухгалтар, Івацэвіцкі раён:

— Жыву ў вёсцы, таму восень для мяне — гэта пераважна клопаты пра запасы на зіму. Калі верасень толькі пачынаецца, галава кругам ідзе ад думак, колькі ўсяго трэба сабраць і схаваць у склеп. Шчыра скажу, што больш радуюся, калі зіма прыходзіць. Пасля ўсіх гэтых восеньскіх клопатаў — нібы выратаванне.

Паліна БАРТАШЭВІЧ, будучы псіхолаг:

— Думаю, усе самыя глабальныя падзеі ў маім жыцці пакуль напарадзе. Восень выклікае ў мяне асацыяцыі з цікімі вечарамі і праглядам добрага кіно ў прыемнай кампаніі. А яшчэ з яблычным пірагом. Мы штогод восенню прывозім шмат яблыкаў з бабулінай дачы.

Крысціна, студэнтка архітэктурнага факультэта БНТУ:

— Напэўна, вучоба. Я не люблю восень: гэта халоднае надвор'е, а значыць псуецца настрой, прыходзяць хваробы.

Ганна ГАРУСТОВІЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Спорт-тайм

«ШАХЦЁР» І «ДЫНАМА» ВЫБЫЛІ З КУБКА БЕЛАРУСІ

Салігорскі «Шахцёр» і мінскае «Дынама», якія змагаюцца за п'едэстал у чэмпіянаце, не вытрымалі кубкавай барацьбы і выбылі з гэтага турніру на стадыі 1/8 фіналу. Салігорцы, працягваючы традыцыю ў чэмпіянаце, дзе яны маюць пяць нічыіх, працягнулі яе і ў Кубку, згуляўшы ў асноўны час з лікам 0:0 з «Гомелем», а ў серыі пенальці стрэлаўшы шанцы на ўдзел у чвэрцьфінале. Гамяльчане, праўда, не той супернік, саступіўшы якому, ствараеш сенсацыю: у барацьбе за медалі чэмпіянату клуб пакуль замацаваўся на трэцім месцы.

А вось сталічнае «Дынама» саступіла камандзе, якая ў сёлетнім чэмпіянаце гучнымі (ды і ўвогуле) перамогамі не вызначаецца. Апошнюю вікторыю ў чэмпіянаце гродзенскі «Нёман» святкаваў аж у чэрвені. На мінулым тыдні каманда з Гродна сустракалася з мінчанамі ў межах чэмпіянату, і дынамаўцы святкавалі тады перамогу 2:1, хоць і «Нёман», трэба аддаць яму належнае, выглядаў годна. Зараз гродзенскі клуб узяў рэванш — 2:1. А ў мінскага «Дынама» чарговая кубкавая сенсацыя са знакам мінус.

Такім чынам, у сёлетні чвэрцьфінал прабіліся тры каманды з другога дывізіёна і адна — з трэцяга, а таксама «Гомель» «Нёман» і «Нафтан» з вышэйшай лігі. Вось вынікі астатніх матчаў:

«Нафтан» (Наваполацк) — «Партызан» (Мінск) (Д2) — 2:1 .
«Белкард» (Гродна) (Д2) — СКВІЧ (Мінск) (Д2) — 1:2.
«Ведрыч-97» (Речыца) (Д2) — «Ліда» (Д3) — 1:2.
«Рудзенск» (Д2) — «Клечаск» (Д2) — 1:3 .

«ДЫНАМА» ЎПЕРШЫНЮ ПЕРАЙГРАЛА РЫЖАН НА ІХ ПЛЯЦОЎЦЫ

Упершыню за гісторыі выступленняў у Кантынентальнай хакейнай лізе сталічнае «Дынама» адолела рыжскіх аднаклубнікаў на іх пляцоўцы. Асноўны час завяршыўся з нічыйным вынікам 2:2, а ў серыі булітаў наш клуб быў мацнейшым 2:0. У складзе мінскага «Дынама» вызначыліся Аляксандр Кулакоў і Лібар Піўко. Буліты рэалізавалі Збынек Іргл і Джэф Плат.

Алена КРАВЕЦ.

УСЁ АБ АДНАРАЗОВАЙ ДАПАМОЗЕ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

На дзяцей, народжаных пачынаючы з 1 кастрычніка, дапамога будзе выплачвацца ў наступных памерах: пры нараджэнні першага дзіцяці — у памеры дзесяцікратнай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці (да 31 кастрычніка ўключна — 4423600 рублёў); пры нараджэнні другога і наступнага дзяцей — у памеры 14-разовай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці (да 31 кастрычніка 6193040 рублёў). Умовы і парадак выплаты дапамогі захоўваецца ранейшы. Акрамя таго, пры нараджэнні двайнят дадаткова паложана аднаразовая выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці на кожнага з дзяцей у памеры двухразовай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму (да 31 кастрычніка — 884720 рублёў). Выплата гэтай дапамогі ажыццяўляецца ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

@ @ @

Нашай сям'і адмоўлена ў назначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Як нам аб гэтым павінны паведаміць: па тэлефоне, пісьмова ці вусна?

— Згодна з Палажэннем аб парадку прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе штомесячнай і (або) аднаразовай сацыяльных дапамог, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 верасня 2009 г. № 458, орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне не пазней як за тры рабочыя дні пасля прыняцця камісіяй адпаведнага рашэння абавязаны пісьмова паведаміць заяўніка аб прызначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі або аб адмове ў яе прызначэнні з указаннем прычын адмовы і парадку абскарджання.

@ @ @

Ці можа распаўсюджвацца калектыўны дагавор на не членаў прафсаюза?

— Калектыўны дагавор рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж наймальнікам і яго работнікамі, прадстаўніком яго заключэння з'яўляецца прафсаюз. У адпаведнасці з артыкулам 365 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, калектыўны дагавор распаўсюджваецца на наймальніка і ўсіх працаўнікоў, ад імя якіх ён заключаны, г.зн. на членаў прафсаюза, калі ў калектыўным дагаворы не прадугледжана іншае. На работнікаў — не членаў прафсаюза — калектыўны дагавор распаўсюджваецца пры ўмове, калі яны выказалі згоду на гэта ў пісьмовай форме.

@ @ @

У арганізацыі ўстаноўлены тэрмін выплаты заработнай платы 10 чысла, але наймальнік перыядычна выплачвае заработную плату на дзень-два пазней устаноўленага тэрміну. Ці з'яўляецца гэта парушэннем заканадаўства аб працы?

— Згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, выплата заработнай платы ажыццяўляецца рэгулярна ў дні, вызначаныя ў калектыўным дагаворы, пагадненні альбо працоўным дагаворы, але не радзей чым два разы ў месяц. Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны» прадугледжана, што выплата заработнай платы ажыццяўляецца рэгулярна ў дні, вызначаныя калектыўным дагаворам (пагадненнем), працоўным дагаворам (кантрактам), але не радзей чым адзін раз у месяц. Пры супадзенні тэрмінаў выплаты заработнай платы з выхадныі днямі (Працоўны кодэкс) альбо дзяржаўнымі святамі і святочнымі днямі, яна павінна ажыццяўляцца напярэдадні іх. Наймальнік абавязаны выплачваць заработную плату работнікам у дні, вызначаныя працоўным дагаворам (кантрактам). Невыкананне тэрмінаў выплаты заработнай платы, устаноўленых у працоўным дагаворы (кантракце) з'яўляецца парушэннем заканадаўства аб працы.

@ @ @

Інваліду 2-й групы з кожным годам усё цяжэй даглядаць свайго састарэлага бацьку. Ці могуць бацьку ўзяць у дом-інтэрнат на ўмовах дзяржзабеспячэння?

— У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку, асаблівасцях і падставах прадастаўлення грамадзянам спецыяльных жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду ў дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, дамах-інтэрнатах для дзяцей-інвалідаў, спецыяльных дамах для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1408, спецыяльныя жылыя памяшканні ў дамах-інтэрнатах агульнага тыпу прадастаўляюцца грамадзянам, што дасягнулі ўзросту, які дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах, інвалідам I і II групы, якія страцілі поўную ці частковую здольнасць да самаабслугоўвання, маюць патрэбу ў доглядзе, дапамозе, бытавым і медыцынскім абслугоўванні, не маюць працаздольных членаў сям'і або іншых фізічных або юрыдычных асоб, абавязаных па законе іх утрымліваць. У канкрэтнай сітуацыі для афармлення ў дом-інтэрнат самому састарэламу альбо яго сыну неабходна звярнуцца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Права на дзяржаўнае забеспячэнне маюць грамадзяне пры адсутнасці ў іх працаздольных членаў сям'і (члены сям'і дасягнулі ўзросту, які дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах або з'яўляюцца інвалідамі 1 і 2 групы), або іншых фізічных ці юрыдычных асоб, абавязаных па законе іх утрымліваць (на падставе дагавора рэнты з выдзяленнем сродкаў на ўтрыманне, дагавора пажыццёвага ўтрымання).

@ @ @

Як індэксуецца заработная плата работніка, які працуе на паўстаўкі? Індэксацыя яго заработнай платы будзе прапарцыйнай адпрацаванаму часу?

— Індэксацыя заработнай платы работнікам бюджэтных арганізацый, якія працуюць у рэжыме няпоўнага працоўнага часу, ажыццяўляецца па ўсталяваным заканадаўствам механізме і не залежыць ад адпрацаванага ім часу: на індэкс карэктуецца налічаная заработная плата ў межах нарматыву індэксацыі (сёння гэта 442360 рублёў). Частка заработнай платы, якая перавышае нарматыў, індэксацыі не падлягае. У арганізацыях небюджэтнай сферы калектыўнымі дагаворамі, пагадненнямі могуць быць прадугледжаны дадатковыя ў параўнанні з устаноўленымі заканадаўствам гарантыі па кампенсацыі работнікам страт ад інфляцыі.

@ @ @

Я працую ў камерцыйнай арганізацыі ў сферы гандлю. Сёння ў рэспубліцы назіраецца істотны рост цэн на тавары і паслугі. Скажыце, калі ласка, ці павінен наймальнік ажыццяўляць індэксацыю маёй заработнай платы?

— Умовы індэксацыі заработнай платы работнікаў залежаць ад таго, ці адносіцца арганізацыя, у якой яны працуюць, да бюджэтнай сферы. Заканадаўствам устаноўлена, што заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый індэксуецца ў абавязковым парадку. Індэксацыя заработнай платы работнікаў небюджэтнай арганізацыі не з'яўляецца абавязковай для наймальніка. Рашэнне аб яе правядзенні прымаецца па ўзгадненні бакоў і павінна быць замацавана ў любым лакальным нарматыўным прававым акце арганізацыі. Напрыклад, у калектыўным дагаворы.

@ @ @

З лістапада, згодна з указам Прэзідэнта, будзе яшчэ адно павышэнне працоўных пенсій. У якім памеры? Які аб'ём сродкаў дадаткова пойдзе на гэтыя мэты?

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2011 года № 327, з 1 лістапада гэтага года будзе праведзены пераразлік працоўных пенсій, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за трэці квартал 2011 года. Паколькі сярэдняя заработная плата работнікаў у рэспубліцы за трэці квартал будзе вядомая толькі пасля 20-га кастрычніка, паведаміць дакладны памер павышэння пенсій і аб'ём дадатковых сродкаў, неабходных для гэтага пераразліку, пакуль што не ўяўляецца магчымым.

@ @ @

Ці справядліва, што ў Мінску з гарадскога бюджэту асобным катэгорыям жыхароў выплачваюцца прэферэнцыі (на сельгаспрадукцыю, надбаўкі бюджэтнікам, дапамога мамам на памперсы і г.д.), а жыхары іншых рэгіёнаў гэтага пазбаўлены?

— У любым выпадку рашэнне прымаецца выканаўчымі і распарадчымі мясцовымі органамі, бо фінансаванне ажыццяўляецца з мясцовага бюджэту. Рэгуляваць гэтае пытанне на рэспубліканскім узроўні нельга. Рэгіёны маюць права прымаць гэтае рашэнне з улікам фінансавых магчымасцяў мясцовага бюджэту.

@ @ @

Калі, нарэшце, будуць павышаны дапамогі на беспрацоўі?

— Сёлета Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь падрыхтаваны прапановы аб павышэнні стыпендый грамадзянам, накіраваным органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на навучанне, перанавучанне ці павышэнне кваліфікацыі. Максімальны памер стыпендыі будзе прадугледжаны для грамадзян, вызваленых у выніку скарачэння колькасці альбо штату работнікаў. У Рэспубліцы Беларусь заяўлена практычна 60 тысяч вакансій, што практычна ўдвая перавышае колькасць беспрацоўных, якія стаяць на ўліку па беспрацоўі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

@ @ @

«Я летась скончыла тэхнікум. На працу так і не змагла ўладкавацца, бо ўсім патрэбны вопыт работы. Чула, што ў цэнтрах занятасці дапамагаюць атрымаць вопыт працы. Ці праўда гэта і куды мне звярнуцца?»

— Сапраўды, з мэтай набыцця беспрацоўнай моладдзю прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў практычнай працы на вытворчасці, павышэння яе канкурэнтаздольнасці на рынку працы, пашырэння магчымасцяў працаўладкавання арганізуецца «Моладзевая практыка». «Моладзевая практыка» арганізуецца на вучнёўскіх рабочых месцах, якія ствараюцца найманымі работнікамі незалежна ад формы ўласнасці, за выключэннем арганізацый, дзейнасць якіх фінансуецца за кошт бюджэтных сродкаў. «Моладзевая практыка» можа арганізоўвацца з наймальнікамі, якія маюць магчымасці і ўмовы арганізацыі вучнёўскіх працоўных месцаў для набыцця беспрацоўнай моладдзю прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па вытворчасці па існуючых у іх спецыяльнасцях, прафесіях і кваліфікацыі. Перавагу маюць наймальнікі, якія забяспечваюць магчымасць далейшага працаўладкавання беспрацоўнай моладзі на пастаянныя рабочыя месцы. «Моладзевая практыка» арганізуецца тэрмінам да шасці месяцаў. З беспрацоўнымі, якія пражываюць у малых і сярэдніх гарадскіх паселішчах і населеных пунктах з устойлівa высокім узроўнем беспрацоўя, а таксама ў сельскіх населеных пунктах, заключаецца кантракт тэрмінам на адзін год. Наймальніку кампенсуюцца затраты па заработнай плаце работніка ў перыяд праходжання «Моладзевай практыкі» ў памеры мінімальнай заработнай платы і абавязковых страхавых узносаў. На вучнёўскія рабочыя месцы накіроўваюцца беспрацоўныя, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне перавышае колькасць зарэгістраваных беспрацоўных практычна ў два разы. На канец мінулага года колькасць незанятага насельніцтва склала 476,3 тысячы чалавек (у 2005 годзе гэтая колькасць складала 841900 чалавек — гэта значыць, адзначаецца дынаміка змяншэння на 365.600 чалавек). Напружанасць на рынку працы пастаянна зніжаецца. На канец жніўня 2010 года яна складала 0,7 беспрацоўных на вакансію, на канец жніўня 2011 — 0,5 (у 2005 годзе — 2 беспрацоўныя на вакансію).

Інга МІНДАЛЁВА.

ЗНІЖЭННЯ ТЭМПАЎ ІНФЛЯЦЫІ МІНЭКАНОМІКІ ЧАКАЕ ПАСЛЯ ЎСТАЛЯВАННЯ РАЎНАВАЖНАГА КУРСУ

Учора аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў студзені—жніўні расказаў Аляксандр Ярашэнка, намеснік міністра эканомікі.

— Зараз назіраецца плаўнае замарудзванне тэмпаў эканамічнага росту, — заявіў намеснік міністра. — Гэта следства палітыкі ўрада, накіраванай на звужэнне ўнутранага попыту. Асноўны ўклад па-ранейшаму ўносяць прамысловасць і гандаль. У той жа час трошкі зніжаецца роля будаўнічай галіны. І гэта, зразумела, звязана са скарачэннем аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва. «Мы разлічваем, што з усталяваннем адзінага курсу і сітуацыя з інфляцыяй таксама стабілізуецца. Напрыклад, у інтэрнэт-крамах ужо заўважана, што за апошнія некалькі дзён цэны значна панізіліся. Курс стаў закладвацца больш рэальны». «Захоўваецца стратнасць рэалізацыі мяса-малочнай прадукцыі, шмат праблем стварае несанкцыянаваны вывад нашай прадукцыі за межы рэспублікі». Намеснік міністра нагадаў, што менавіта для барацьбы з апошнім Мінэканомікі паступова павышае цэны. Аляксандр Ярашэнка адзначыў, што «мы маем вялікі прырост экспарту», і падкрэсліў, што адбыўся ён пры росце вытворчасці. Намеснік міністра эканомікі засяродзіў увагу на збалансаванасці паміж прадукцыйнасцю працы і рэальнай зарплатай: «На пачатак года разрыў паміж імі быў каля 20 працэнтных пунктаў. Зараз ён скараціўся да 2,9 працэнта. Маецца на ўвазе тое, што мы набліжаемся да сітуацыі, калі рэальна зарабляем тыя грошы, якія атрымліваем». Аднак у той жа час рэальныя грашовыя даходы насельніцтва знижаюцца.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Абзац

◢ На 1 верасня 2011 года аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі ў вызначэнні МВФ склаў $4604,3 млн, а ў нацыянальным азначэнні — $6202,2 млн у эквіваленце, што на $46,9 млн больш за ўзровень на пачатак гэтага года.

◢ **Пажар у вёсцы Мацюшы Полацкага раёна адбыўся позна ўначы ў шчытавым доме, абліцаваным цэглай, дзе пражывала маці і яе дарослы сын. Яшчэ да прыбыцця пажарных на месца здарэння дом быў цалкам ахоплены агнём, а праз некалькі хвілін дах абрынуўся. Выратаваць жыхароў было немагчыма. Іх трупы былі знойдзены пазней пад канструкцыямі, якія абваліліся. Магчымай прычынай узгарання стала неасцярожнасць пры курэнні сына гаспадыні, які знаходзіўся ў нецвярозым стане.**

◢ Шырокае святкаванне стагоддзя паэта Максіма Танка плануецца ў Беларусі ў 2012 годзе. На працягу года ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры запланавана правядзенне экспазіцыі і выстаў. Міністэрству інфармацыі даручана выданне і прэзентацыя кнігі ўспамінаў пра Максіма Танка ў серыі «Жыццё вядомых людзей Беларусі». Запланавана таксама правядзенне тэматычных канцэртных праграм і рэспубліканскага паэтычнага конкурсу.

◢ **У санаторыях Беларусі за студзень—верасень 2011 года адпачылі 137 тыс. замежнікаў. Плануецца, што за ўвесь год пуцёўкі ў санаторна-курортныя арганізацыі рэспублікі набудуць каля 200 тыс. замежнікаў. У 2010 годзе ў Беларусі адпачылі і ўмацавалі здароўе 173 тыс. чалавек з блізкага і далёкага замежжа — на 5 тыс. чалавек больш, чым у 2009-м. З іх 95% — расіяне і жыхары краін Балтыі.**

◢ Пілотны праект па ўкараненні цеплавой помпы з выкарыстаннем геатэрмальных крыніц энергіі рэалізаваны ў Мінскай вобласці на базе Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы. Праект рэалізуецца кампаніяй «Ілмакс». Гэта першы вопыт выкарыстання ў рэспубліцы альтэрнатыўных крыніц цяпла і гарачага водазабеспячэння. Для гэтага было зроблена 60 свідравін глыбінёй да 100 м. Пры тэмпературы да мінус 9 градусаў цацельня можа працаваць без газу. У выпадку паніжэння тэмпературы яна аўтаматычна пераходзіць на газавае ацяпленне. Падобныя тэхналогіі шырока практыкуюцца ў Еўропе — у прыватнасці, для ацяплення цяпліц, аб'ектаў сацкультбыту.

◢ **Разрыў паміж тэмпамі росту рэальнай заработнай платы і прадукцыйнасці працы ў Беларусі скараціўся да 2,9 працэнта. У пачатку года ён складаў 20%.**

Фатограф Іван кожны год прыязджае адпачываць з Масквы на мора і аднойчы даведваецца пра незвычайны стары фотаапарат: калі сфатаграфаваць ім дзяўчыну, то дзяўчына закахаецца ва ўладальніка гэтай фатаграфіі.

Рэжысёр — Аляксей Калмагораў. **У ролях:** Станіслаў Бяляеў, Наталля Швец, Лія Ахеджакава, Юозас Будрайціс.

ЧАЦВЕР, 29 ВЕРАСНЯ

ПЕРШЫ

6.00, 7.10, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
7.05, 8.05, 18.50 «Зона Х».
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.35 Зямельнае пытанне.
9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».
10.05, 16.50 Серыял «На нажах».
11.05, 17.55 Серыял «Дыхай са мной».
12.10 Меладрама «Настаўнік музыкі».
13.55 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.35 М/с «Іван і Мітрафан».
15.50 «Маэстра, музыку...». Дак. фільм.
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў.
22.30 Драма «Мяжа кантролю».
0.40 Дзень спорту.
0.55 «У пошуках ісціны». «Міхаіл Булгакаў».

АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00 (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
6.10 «Наша раніца».
9.10 «Жыць здорава!».
10.20 «Зразумець. Дараваць».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Закінуты свет». Серыял.
12.00 «Умовы кантракта». Серыял.
13.10 «Хачу ведаць».
13.40 «Кантрольная закупка».
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.
16.15 «Участковы дэтэктыў».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Каралева экрана». Серыял.
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 «Трохі не ў сабе». Серыял.
22.15 «Атлантыда». Серыял.
23.15 «Несакрэтныя матэрыялы».
23.45 «Адваротны адлік».
0.15 «Умовы кантракта». Серыял. Заключныя серыі.
2.00 Начныя навіны.

ЛАД

7.00 ЛАДная раніца.
8.00 Тэлебарометр.
8.05, 17.55 Серыял «Ты маё жыццё».
9.10, 20.55 Серыял «Барвіха».
10.10 «Страсць і ўлада».
11.15 Канцэрт Bryan Adams.
12.25 Рэальны свет.
12.55 Страсці па культуры.
13.35 Меладрама «Віцька Шушара і аўтамабіль».
15.00 Гадзіна суда.
16.05 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
16.40 Баявік «Снайпер. Зброя адплаты». Заключная серыя.
18.55 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Лакаматыў — Андэрлехт.
21.55 КЕНО.
22.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Спортынг — Лацыа.
0.00 Час футбола.
0.45 Рэальны свет.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Двайная прапажа».
10.40 Серыял «Нашы суседзі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 Серыял «Агонь кахання».
13.50 Серыял «Дурні, дарогі, грошы».
14.40, 23.20 Серыял «Падкідны».
15.35 Серыял «Ніна».
16.50 «Мінск і мінчане».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.25 Трылер «Мечаносец».
23.00 «Аўтапанарама».
0.05 Серыял «Жорсткі бізнэс».

МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
5.05, 9.05, 14.35 «Садружнасць LIVE».
5.20, 15.25 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.05 «Цік-так».
6.25 М/с «Робін Гуд».
7.05, 4.00 Серыял «Рускія амазонкі».
8.05, 22.05 «Жывая гісторыя».
9.25 «Сардэчна запрашаем».
10.05 Серыял «Багатая і каханая».
11.05 Маст. фільм «Бацькі і дзяды».
13.05 М/с «Прыгоды майстра Кун-фу».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05 Серыял «Ёхан ды Мар'я».
16.05, 17.05 Серыял «Агонь кахання».
18.25 «Акцэнты».
18.40, 2.00 «Дыяспары».
19.00, 2.30 Серыял «Паляўнічыя за абразамі».
19.50, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 3.30 «Канец свету».
23.05, 0.05 Серыял «Плюс бясконцасць».

8 КАНАЛ

7.00, 12.10, 14.05, 18.55, 21.00, 23.30 «Надвор'е».
7.05, 14.10 Серыял «Сапраўднае каханне».
8.40, 15.10 «Кінаблакнот».
9.00, 18.00 Серыял «Зачараваныя».
10.00, 16.00 Мультпарад.
10.30, 19.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
12.15 Трылер «Марскі пехацінец».
16.25 «К-гульні» — «Лайт».
16.30 «Мой любімы гадаванец».
17.00 Серыял «Закаханы агент».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Камедыя «Ангар».
22.45 «Бульбокс».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 18.00, 23.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 20.00 Серыял «Вароніны».
10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
11.00, 22.00 Серыял «Аманда О».
12.00, 17.00 «Хачу верыць».
13.00 Серыял «Як сказаў Джым».
14.00 Серыял «Галыгін.ru».
15.00 Серыял «Ранеткі».
16.00, 0.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
19.00, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 16.20 «Кулагін і партнёры».
12.00, 21.35 Серыял «Контргульня».
13.50, 16.50, 19.50, 0.15 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае».
15.25 «З новым домам!».
17.35 Весткі. Дзяжурная часць.
17.50 Серыял «Сёстры па крыві».
18.50 Серыял «Ефрасіння. Працяг».
20.30 «Прамы эфір».
23.25 Серыял «Ненармальная».
0.25 «Паядынак».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 «НТБ раніцай».
8.35 «Таямнічая Расія».
9.35, 15.35, 18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.40 Сёння.
10.20 «Следства вялі...».
11.10 «Да суда».
12.05 «Суд прысяжных».
13.25 Серыял «Асноўная версія».
15.10 «Справа густу».
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем».
19.45 Маст. фільм «Служу Айчыне!».
21.40 Серыял «Глухар. Вяртанне».
23.05 «Генералы халоднай вайны. Эдуард Шэварднадзэ».
0.00 Серыял «Сталіца граху».
0.45 Серыял «Школа».

ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.05 М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
6.25, 9.45 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30, 17.30, 19.30 «Універ».
8.30, 18.00 «Зайцаў + 1».
9.00, 18.30 «Шчаслівыя разам».
12.00 М/с «Пінгвіны з «Мадагаскара».
13.00 «Жаночая ліга».
13.30, 22.00, 23.00, 2.50 «Дом-2».
15.25 «Улётны транспарт». Камедыя.
17.00, 19.00 «Інтэрны».
20.00 Камедыя «Нянькі».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Дзённікі вампіра».
0.50 «Каханне не каштуе нічога». Меладрама.
3.50 «Школа рамонту».
4.50 «Саша + Маша».

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 З новай раніцай.
9.10, 16.20, 23.30 Серыял «Белы ікол».
9.35, 16.45, 23.55 Серыял «Так мала часу».
10.20, 17.30, 5.20 Дак. серыял «Выдатнае 20-е стагоддзе».
11.15, 20.35 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Знак якасці.
12.45, 19.15, 2.15 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
13.30, 0.40 Сямейны суд.
14.15 Судовыя справы.
14.55 Купаж.
15.10, 23.05, 6.15 Дак. серыял «Выдатныя асобы».
15.30, 22.15, 4.30 Серыял «Партнёры».
18.10, 1.25 Ток-шоу «Усе свае».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.30, 3.30 Спорт у Падрабязнасцях.
21.20, 3.35 Серыял «Сваты-4».
6.40 Феерыя падарожжаў.

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Наглядальнік».
10.15 «Сёе-тое з губернскага жыцця». Маст. фільм.
11.45, 18.10, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
12.00 «Графічныя вобразы свету». Дак. серыял.
12.50 «Вітус Берынг». Дак. фільм.
13.00 «Траццякоўка — дар бясцэнны!».
13.30 «Скандальнае здарэнне ў Брыкмілe». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.40, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
14.50 «Арсон і Алівія». М/с.
15.15 «Церамок». М/ф.
15.20 Серыял «Уладар маланкі».
15.45 «Дзікая прырода Венесуэлы». Дак. серыял.
16.10 «Парадны партрэт улады».
16.35 «Шастаковічу прысвячаецца...».
17.15 «Мой Шастаковіч». Дак. фільм.
18.45 Галоўная роля.
19.05 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
19.45 «Ціханаў. Імгненні славы». Дак. фільм.
20.25, 0.55 Academia.
21.15 «Культурная рэвалюцыя».
22.00 «Ад 0 да 80. Сімон Шноль». Дак. серыял.
22.50 «Трэнк. Каханне супраць кароны». Маст. фільм. 1-я серыя.
0.20 А. Барадзін. Сімфонія № 2 «Волатаўская».
0.50 «Арман Жан дзю Плесі дэ Рышэлье». Дак. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «СевАлогія».
6.20 «Птушка шчасця заўтрашняга дня». Дак. фільм. 1985 год.
6.40 «Ананімка». Спектакль. 1987 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Мы спяваем вершы...». 1985 год.
11.00 «Міжнародная панарама». 1982 год.
12.00 «Рытмічная гімнастыка». 1985 год.
12.40, 18.40 «Раферці». Маст. фільм.
17.00 «Вяртанне...». Юрый Любімай. 1989 год.
18.00 «Песні памяці маёй». Фільм-канцэрт.
22.00 «Тэма». 1993 год.
23.00 «З жыцця дзяцей, або Абрабаванне». Дак. фільм. 1987 год.
23.45 «Зорны час». 1993 год.
0.40 «Выпадак з палкоўнікам Дарвінам». Спектакль. 1985 год.
4.00 «Мелодыі лета». 1968 год.

MTV

5.00, 2.20 Music.
6.00, 7.45 Стэрэа_раніца.
7.35 FAQ.
8.30 «Губка Боб». М/ф.
9.20 Тачку на пракачку.
9.45 Магія Крыса Энджэла.
10.10 Праверка чутак.
10.40, 19.00 «Подыум».
11.30, 0.30 «Тайком ад бацькоў». Серыял.
12.20, 22.50 News блок.
12.30, 17.30, 1.20 «Вольны».
13.00, 16.30, 21.00, 23.00 «Канікулы ў Мексіцы».
14.00 Школа хуліганаў.
14.50, 0.05 Кахаць або забіць.
15.15, 23.40 Спатканне на выжыванне.
15.40 Наступны.
16.05 Бобыск і спатканне.
18.00 News Блок XXL.
20.00 Каханне з першага погляду.
22.00 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
23.15 «Клініка». Серыял.
1.50 «13 кіналаж».

НАША КІНО

6.30, 12.30 Трагікамедыя «Яно».
8.30, 14.30 Драма «Ціхі Дон», 2-я серыя.
10.30, 16.30 Фільм-опера «Пікавая дама».
18.30, 0.30 Трагікамедыя «Будзь пільным!».
19.50, 1.50 Навела «Сола».
20.30, 2.30 Драма «Ціхі Дон». 3-я серыя.
22.30, 4.30 Меладрама «Печкі-лавачкі».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Ледніковы перыяд».
3.50 Новы хіт. Меладрама «Манро».
5.25 Трылер «Камітэт 19-ці».
8.00 Золата «Масфільма». «Законны шлюб».
9.30 Новы хіт. Чорная камедыя «Начны прадавец».
11.50 Крымінальная драма «СЭР (Свобода — это рай)».
13.05 Меладрама «А калі гэта каханне?».
14.45 Музычная камедыя «Дзе б ні працаваць...».
16.05 Дэтэктыў «Начное здарэнне».
17.35 Новы хіт. Драма «Палата № 6».
19.50 Новы хіт. Лірычная камедыя «Рамонак, кактус, маргарытка».
21.25 Гістарычная драма «Шклянка вады».
23.35 Баявік «У зоне асаблівай увагі».
1.10 Драма «Камуніст».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Вялікае касмічнае вандраванне».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Маўглі». «Зборнік м/ф «Вясёлка». «Алё! Вас чую!». «Вагончык».
7.00, 11.00 М/с «Фархат — прынц Персіі». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Шэрая шыйка». М/ф «Цудасея».
8.00, 12.00 «Урокі цётачкі Савы». «Зборнік м/ф «Маленькі Шэго». «Карпуша».
15.00 Маст. фільм «Сын палка». 1 серыя.
16.10 М/с «Маўглі». «Зборнік м/ф «Прыгоды Чычыкава. Наздроў». «Карусельны леў».
17.00 М/с «Фархат — прынц Персіі». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Як адзін мужык двух генералаў пракарміў». М/ф «Ваўчок».
18.00 «Урокі цётачкі Савы». М/ф «Як качаня-музыка стала футбалістам».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Перадзел. Кроў з малаком».
20.00, 2.00 Серыял «Абарона Красіна-3».
21.00 Серыял «Сышчыкі-2».
22.00, 23.30 Серыял «Цішыня».
3.00 Серыял «Сышчыкі-3». 1-я серыя.

ТБ3

5.00 М/ф.
5.30 Серыял «Трэцяя планета ад Сонца».
6.00 Серыял «Блэйд».
7.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».
8.00, 15.00 «Разбуральнікі міфаў».
9.00, 17.00 Дак. фільм «Звязтыя».
10.00, 16.00 Серыял «Заўтра надыдзе сёння».
11.00, 18.00 Серыял «Купідон».
12.00, 19.00 Серыял «Дзяжурны анёл».
13.00, 20.00 Серыял «Касл».
14.00 Серыял «Здабыча». 1-я серыя.
21.00 Маст. фільм «Аперацыя «Мёртвы снег».
22.45 Серыял «Зорная брама: Сусвет».
23.45 Серыял «Андрамеда».
0.30 Маст. фільм «Гоблін».
2.30 Серыял «Застацца ў жывых».
3.30 Дак. фільм «Ажыўленне людзей».
4.30 М/ф.

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Меладрама «Каханне яшчэ магчыма».
10.40, 18.40, 2.40 Серыял «Спецыяльнае падраздзяленне-2».
11.35, 19.35, 3.35 Камедыя «Чырвоны гатэль».
13.15, 21.15, 5.15 Драма «Сны аб Расіі».
15.25, 23.25, 7.25 Трылер «Пульс».

ТБ1000

3.00, 21.00 Меладрама «Як вада для шакаладу».
5.00 Драма «Імператарскі клуб».
7.05 Драма «Адстрэльваючы сабак».
9.00 Драма «Адстрэльваючы сабак».
11.00 Камедыя «Тусоўшчыкі з супермаркета».
13.00 Драма «Каханне здараецца».
15.00 Камедыя «Смерць ёй да твару».
17.00 Камедыя «Залегчы на дно ў Бругу».
19.00 Драма «Фанатык».
23.00 Драма «Мірны воін».
1.20 Драма «Дарфур: Хронікі абвешчан

«Перазагрузка» па лініі Беларусь—ЕС магчымая...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Партнёрства павінна таксама распаўсюджвацца на культурна-інфармацыйную, адукацыйную і навукова-даследчую сферы, садзейнічаць развіццю двухбаковых кантактаў, рэалізацыі сумесных узаемавыгадных праектаў, абмену досведам на розных канферэнцыях і форумах.

— Дарэчы, аб форумах. Не ведаю як вас, а мяне трохі здзівіла навіна аб запрашэнні паўдзельнічаць у першым бізнэс-форуме Усходняга партнёрства намесніка міністра эканомікі Беларусі Антона Кудасава. Форум, нагадаю, пройдзе 30 верасня ў польскім горадзе Сопат адначасова з самітам «Усходняга партнёрства». На фоне мэтавых санкцый і іншых адрасных дзеянняў ЕС да нашай краіны гэтае запрашэнне чыноўніка з Беларусі выглядае даволі незвычайна. Ці не азначае гэты крок пачатак пацяплення ў адносінах з Еўропай — у прыватнасці, з Польшчай, якая цяпер выконвае функцыю старшыні ЕС?

— Вядома, удзел у рабоце бізнэс-форума сам па сабе з'яўляецца важнай і карыснай справай. І факт запрашэння беларускіх прадстаўнікоў — крок пазітыўны. Нагадаю, у асобных замежных СМІ выказваліся прагнозы наконт адмовы афіцыйнаму Мінску ва ўдзеле ў праграмах Усходняга партнёрства, асабліва тых, якія могуць прынесці Беларусі эканамічную выгаду. Аднак Еўрасаюз усё ж вырашыў працягваць дыялог з беларускімі ўладамі, у тым ліку, як мы бачым, шляхам удзелу афіцыйных прадстаўнікоў у сопацкім форуме. Гэта, на мой погляд, добры фармат для актывізацыі ўзаемадзеяння ў дзелавой сферы, фармат, які дазваляе ў пэўнай ступені знізіць вострыя палітычныя рознагалоссі.

Праўда, ёсць адна слушная заўвага. Агульнапрынятай з'яўляецца практыка, калі сама краіна вызначае тых, каго накіраваць на той ці іншы форум, надзяляе гэтых асоб адпаведнымі паўнамоцтвамі, зыходзячы са свайго бачання, сваіх прыярытэтаў і інтарэсаў удзелу ў міжнародным мерапрыемстве. Таму запрашэнне менавіта А. Кудасава ў пэўнай ступені выглядае даволі двухсэнсоўна.

— Форум у Сопаце — польская ініцыятыва. Не здаецца вам, што ў Польшчы празмерныя прэтэнзіі на асаблівую ролю ва ўсходнееўрапейскіх справах. Адкуль гэта?

— Імкненне Польшчы заняць ключавое месца ў адносінах Бруселя з Беларуссю, Украінай ды і ўсім новым усходнім памежжам ЕС, безумоўна, існуе. Заўважу, што традыцыя рэгіянальнага лідарства Польшчы даўно ўкаранілася ў польскай палітычнай думцы і ментальнасці. Тыя старадаўніе ідэі сёння абноўлены, яны запатрабаваны ў грамадстве і складаюць частку не толькі палітычнай тэорыі, але і практыкі афіцыйнай Варшавы. Уплывовыя польскія палітыкі традыцыйна былі выразнікамі гэтых ідэй, а самі ідэі заахвочвалі з'яўленне новых палітыкаў. І як мне ўяўляецца, сучасная знешняя палітыка Польшчы ў вельмі вялікай ступені адлюстроўвае даўнія традыцыі польскай рэгіянальнай палітыкі, а таксама польскай палітычнай філасофіі. Аднак польскія знешнепалітычныя ініцыятывы не заўсёды знаходзяць падтрымку ў Бруселі. Гэта таксама трэба мець на ўвазе.

— Напрыканцы вясны Еўрапейская камісія выступіла з прапановай рэфармавання палітыкі суседства. Яна, як заяўлялі ў Бруселі, стане своеасаблівым «новым адказам на змены ў краінах-суседзях». Увогуле, што гэта будзе за рэформа і ці яна закране Беларусь?

— На мой погляд, адбылося тое, што павінна было адбыцца, — вяртанне да рэалій. Шматлікія палітыкі і каментатары надавалі занадта вялікае значэнне ініцыятыве пад назвай «Усходняе партнёрства». Парознаму прымяралі гэтую праграму да сваёй вялікай геапалітычнай гульні на прасцягах Еўропы, нават пафасна называлі яе інструментам руху заходняй цывілізацыі на ўсход і г.д. Але ў краінах-суседзях, для якіх і была распрацавана праграма, дамінаваў прагматычны падыход да яе рэалізацыі. Краіны-суседзі бачылі ва Усходнім партнёрстве ў першую чаргу магчымасць для сябе наладзіць узаемавыгадныя і раўнапраўныя адносіны з новым вялікім суседам — Еўрапейскім саюзам. Думаю, што і ў Бруселі, і іншых сталіцах краін ЕС адказныя палітыкі таксама не разглядалі праграму як прыладу для своеасаблівай «еўрапеізацыі» суседзяў. Бо гэта, у прынцыпе, не варта рабіць, ды і ўвогуле немагчыма.

Цяпер у палітыку Бруселя вяртаецца больш рэалістычны падыход да адносін з суседзямі. Вось яго адметныя рысы. Па-першае, гэта канкрэтызацыя краінавых праграм з улікам іх пэўнай спецыфікі. Па-другое, канкрэтызацыя фінансавых інструментаў і фондаў у дачыненні да кожнай краіны. Па-трэцяе, канкрэтызацыя тэрмінаў рэалізацыі асобных праектаў. З іншага боку, палітычны складнік супрацоўніцтва ўсё ж застаецца ў цэнтры ўзаемадзеяння. Тут можна зразумець еўрапейцаў. Яны не могуць саступіць у пытанні так званых агульнаеўрапейскіх каштоўнасцяў. Хоць самі каштоўнасці, мушу заўважыць, катэгорыя ідэалагічная, якую можна па-рознаму інтэрпрэтаваць. Але гэта тэма асобнай размовы.

— Што вы думаеце аб прыярытэтах абнаўлення супрацоўніцтва Еўрапейскага саюза з краінамі-суседзямі?

— Прыярытэт зараз ва ўсіх адзін — гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, накіраванае на пераадоленне негатыўных тэндэнцый у фінансавай і гаспадарчай сферах. Для нас гандаль з краінамі Еўрасаюза — стабільная крыніца паступлення цвёрдай валюты, а таксама прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, неабходнай для развіцця прамысловасці. Аднак патэнцыял узаемнага гандлю задзейнічаны даволі слаба. Хаця ў ЕС даўно і шмат гаворацца аб падтрымцы малых і сярэдніх прадпрыемстваў у суседніх краінах, неабходнасці стварэння зоны свабоднага гандлю і г.д. Думаю, ужо надышоў час пачаць яе ствараць. Бо хочацца ўбачыць канкрэтныя вынікі гэтай дзейнасці.

Але будзем рэалістамі. У адносінах Беларусі і ЕС застаецца занадта шмат нявырашаных пытанняў. З 1992 г. ЕС падыходзіць да Беларусі як краіны «з нярынкавай эканомікай», што з'яўляецца ключавым момантам для стрымлівання развіцця гандлёвых адносін. Антыдэмпінгавыя меры ЕС перашкаджаюць экспарту чатырох беларускіх тавараў: хлорыстага калію (з 1992 г.), поліэфірных штапельных валокнаў (з 1996 г.), поліэфірных філаментных нітак і карбамідна-аміячнай сумесі (з 1997 г.). З 2007 г. Беларусь таксама выключана з Агульнай сістэмы прэферэнцый ЕС.

З іншага боку, быў перыяд, калі ЕС прызнаваў неэфектыўнасць мер па шырокай гандлёвай ізаляцыі Беларусі і схіляўся да больш гнуткага падыходу. Гэта ў свой час надавала станоўчую дынаміку ў гандлёва-эканамічных узаемаадносінах Беларусі з ЕС. Тым не менш комплекс нетарыфных мер да прадукцыі беларускіх вытворцаў, які выкарыстоўвае ЕС, застаецца галоўным фактарам, які стрымлівае беларускі экспарт у краіны ЕС. Каб вырашыць гэтыя праблемы, неабходна шукаць новыя магчымасці для супрацоўніцтва, а не толькі чакаць выканання ад партнёра папярэдніх умоў. Мы, паўтаруся, «асуджаныя» на цеснае супрацоўніцтва.

— Еўракамісія мае намер значна павялічыць бюджэт новай палітыкі суседства. Аднак аб'ём падтрымкі Бруселя суседзяў будзе залежаць ад выканання імі пэўных умоў. Напрыклад, чым далей і хутчэй краіна ідзе наперад па шляху рэформаў, тым больш вялікую дапамогу яна атрымае ад ЕС. Як і хто будзе вызначаць узровень і ступень гэтага прагрэсу і ці варта Беларусі ўцягвацца ў такое спаборніцтва?

— Гэта цікавае пытанне. Але на яго павінны дакладна і ясна адказаць еўрапейскія партнёры. Але я засцярог бы ад празмерных чаканняў вялікіх фінансавых плыняў на ўсход. Акрамя ўсяго, трэба мець на ўвазе тыя вельмі сур'ёзныя праблемы і цяжкасці, з якімі сёння сутыкнулася «зона еўра».

— З чаго ў кантэксце рэформы палітыкі суседства варта было б пачаць яе рэалізацыю на беларускім кірунку? Ці не са спрашчэння і лібералізацыі візавага рэжыму?

— Гэта быў бы своечасовы і сімвалічны крок, які б дазволіў у значнай ступені мінімізаваць многія негатыўныя наступствы пашырэння ЕС. Напрыклад, чаму б не ўвесці для прыгранічнага насельніцтва спрошчаную працэдуру ўзаемных паездак у краіны ЕС, адмовіцца ад марудных і, як мне здаецца, занадта недаверлівых працэдур атрымання віз беларускімі грамадзянамі. Беларусь не стварае ніякай міграцыйнай напружанасці Еўропе. У еўрапейцаў няма ніякіх падстаў палохацца наплыву беларусаў. У нас цудоўная еўрапейская краіна, якая нічым не горшая за іншыя, і беларусы звязваюць свой лёс і сваю будучыню перш за ўсё з Айчынай.

Гутарыў
Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Стартаваў чэмпіянат па хакеі сярод аматарскіх каманд

21 верасня на арэне хакейнага клуба «Юнацтва» стартаваў 11-ты чэмпіянат Мінска па хакеі з шайбай сярод аматарскіх каманд, арганізатарам якога з'яўляецца Прэзідэнцкі спартыўны клуб.

17 шайбаў было закінута ў матчы-адкрыцці паміж прынцыповымі супернікамі — пераможцам мінулага чэмпіянату камандай «Рубеж» і сярэбраным прызёрам гэтага чэмпіянату камандай «Будаўнік». Пяціразовы чэмпіён «Рубеж» перамог з лікам 10:7.

У складзе каманды-чэмпіёна асабліва вызначыўся Алег Антоненка, які на пару з Андрэем Аставшэвічам закінуў тры шайбы і двойчы асісціраваў партнёрам.

У вышэйшай лізе сёлета прымуць удзел 13 каманд, якія выступаюць у турніры на працягу некалькіх апошніх гадоў: акрамя «Рубяжа» і «Будаўніка», гэта «МТМ», «Сталіца», «Характар», «Атлант», «МІФ», «Ва-банк», «Спорт-Люкс», «Мікст», «Лядовыя львы», «Мінскія маланкі» і «Вікінг». Матчы спаборніцтваў будуць праходзіць на чатырох лядовых пляцоўках: у Палацы спорту, на арэне хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск», у Лядовым палацы і на малой арэне Палаца спорту.

Алена КРАВЕЦ.

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний **формы 2РН серии БН № 0943848 считать недействительным.** УНП 101883943

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Аукцион состоится **3 ноября 2011 г. в 11.25** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8 (0222) 229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Могилевское РУП «Фармация», тел. 8 (0222) 220837; по лоту № 2 – РУП «Могилевэнерго», тел. 8 (0222) 293143; по лоту № 3 – РУП «Белтелеком», тел. 8 (0222) 292133; по лотам №№ 4, 5 – ГУ «Могилевская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», тел. 8 (0222) 257561; по лоту № 6 – РУП завод «Могилевлифтмаш», тел. 8 (0222) 262446; по лоту № 7 – Белорусский государственный концерн по нефти и химии, тел. 8 (0225) 433012; по лоту № 8 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8 (0225) 474708.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **1 ноября 2011 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **3 ноября 2011 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Информация о земельных участках: Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.	Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
1	Здание аптеки одноэтажное, бревенчатое обложено кирпичом 103,7 кв.м; уборная дощатая 1,14 кв.м; котел отопительный КС-ТГ-20.	Могилевская обл., Могилевский р-н, Семукачский с/с, дер. Семукачи	20 285,774	0,0574	19	138,650	20 424,424	2 000,0
2	Административное здание одноэтажное, кирпичное, 76,1 кв.м; здание гаража на 3 бокса одноэтажное, кирпичное, 116,1 кв.м; здание уборной кирпичное, 3,2 кв.м; забор деревянный на бетонных столбах с воротами металлическими и калиткой деревянной 142,93 м; тротуарная дорожка цементобетонная 21 кв.м; площадка асфальтобетонная с бордюром 403 кв.м.	Могилевская обл., г. Горки, ул. Тимирязева, д. 15В	78 317,207	0,1098	10	8 039,708	86 356,915	8 000,0
3	Склад одноэтажный, шлаковый 28 кв.м; гараж одноэтажный, блочный 62 кв.м.	Могилевская обл., Осиповичский р-н, рп Елизово, ул. Кирова, д. 36	19 601,320	0,0692	10	1 773,364	21 374,684	2 000,0
4	Административное здание одноэтажное, бревенчатое обложено кирпичом 77,51 кв.м с сараем дощатым, сараем-котельной кирпичным, уборной кирпичной; гараж одноэтажный кирпичный 27,72 кв.м; забор – металлическая сетка (с калиткой и воротами) 121 кв.м; дорожка бетонная 9 кв.м; котел отопительный КС-ЦГ-20.	Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Ленина, д. 80	23 613,298	0,0800	10	7 809,228	31 422,526	3 000,0
5	Административное здание одноэтажное, сборно-щитовое, облицовано кирпичом, 60,47 кв.м, дорожка бетонная 6 кв.м, ограждение 29 кв.м.	Могилевская обл., г. Чериков, ул. Карла Маркса, д. 32	7 658,677	0,0262	25	1 909,339	9 568,016	900,0
6	Незавершенное законсервированное капитальное строение одноэтажное, стены панельные, кирпичные площадью 7 355,5 кв.м.	г. Могилев, Славгородское шоссе	1 377 560,038	2,4896	50	360 187,587	1 737 747,625	100 000,0
7	Здание тяговой подстанции № 6 одноэтажное, кирпичное, площадью 194,5 кв.м.	Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Ульяновская, д. 50А	85 110,863	0,0313	60	32 769,960	117 880,823	11 000,0
8	Находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Бобруйский машиностроительный завод» здание бывшего детского сада/яслей № 35 одноэтажное, кирпичное, 357,0 кв.м с дорожками и ограждениями, канализационная и водопроводная сети	Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, д. 234б	48 985,475	0,1930	15	53 053,380	102 038,855	10 000,0

Начальная цена недвижимого имущества, входящая в состав лотов №№ 5, 6, 8, понижена на 50 процентов.

Победителям аукциона в отношении земельных участков, право заключения договоров аренды которых входит в состав лотов №№ 7 и 8, предоставляется возможность рассрочки платежа по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков на срок, не превышающий 2 лет со дня принятия Бобруйским горисполкомом решений о предоставлении победителям аукциона земельных участков.

Условие для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договоров аренды которых входит в состав лотов:

№ 2 – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества, получить в установленном порядке разрешение Горецкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, установленный законодательством; занятие (освоения) земельного участка не позднее срока, определенного проектно-сметной документацией; осуществление государственной регистрации земельного участка, права на него в сроки, соответствующие законодательству;

№ 3 – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества, получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Осиповичского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года;

№ 5 – в случае изменения назначения недвижимого имущества получение в установленном порядке разрешения Чериковского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление государственной регистрации земельного участка, права на него в сроки, соответствующие законодательству;

№ 6 – в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенного на аукционе объекта недвижимости); осуществление государственной регистрации земельного участка, права на него в сроки, соответствующие законодательству;

№№ 7 и 8 – осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в сроки, соответствующие законодательству; в случае изменения целевого назначения объекта недвижимости – получить в установленном порядке разрешение Бобруйского горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда», по лотам: №№ 1,3,4 – 15 июля 2011 г.; №№ 2,5,6 – 23 июля 2011 г.; №№ 7,8 – 10 августа 2011 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 сентября 2011 года проводит 14-й повторный открытый аукцион на 15-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
116	Мастерская МТО-В № Л35122 на ЗИЛ-131, ш. 390063, дв. 125582, кунг КМ-131 № 800442, 4 кат.	г. Минск, в/ч 63755	1980	2 926	30 000 000	3 000 000
117	Мастерская МТО-В № П35106 на ЗИЛ-131, ш. 521859, дв. 817302, кунг КМ-131 № 630009, 4 кат.	г. Минск, в/ч 63755	1983	3 109	33 500 000	3 350 000
118	Мастерская ремонтная слесарная МРС-АР № 065 на ЗИЛ-131, ш. 655658, дв. 469415, кунг КМ-131 № 15103, 4 кат.	г. Гомель, в/ч 63604	1986	18 188	24 000 000	2 400 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **30 сентября 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **27 сентября 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **30 сентября 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в Центре банковских услуг № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

Назначенный
Лепельским районным потребительским обществом
на 26 сентября 2011 года
аукцион по продаже здания
по адресу:
г. Лепель, пер. Озерный, 16,
не состоится.
УНП 300414037

Нефармат

СЕМ ЦУДАЎ НАШАЙ РЭЧАІСНАСЦІ?

І першы цуд, вядома, долар. То ён знік з канцамі, то з'явіўся: бяры — не хачу. Калі долараў не было ў абменніках, нам нярэдка казалі: «А навошта вам чужая зялёная валюта, усё ж можна купіць за свае?» Так, купіць можна амаль усё, а вось выехаць нават на тры кіламетры ад мяжы без гэтых злашчасных чужых — ні нагой. Ну як, седзячы, напрыклад, у Брэсце, не з'ездзіць у былы яго прыгарад — Цярэспаль, альбо не наведацца ў суседнюю Украіну? За свае можна толькі білет купіць у адзін бок, ды і то ўкраінскі, а ў Польшчу візу за свае, як вядома, не адкрыеш.

Нам, многія памятаюць, казалі летам, што на замежныя паездкі можна набыць валюту ў банку, а на паездкі, звязаныя з лячэннем, зусім без праблем. На справе аказалася, мякка кажучы, больш складана. Ну вось летам, напрыклад, я купляла пуцёўку на тур па Еўропе. Некаторыя таварышы па групе, клиенты фірмы «Крыс», адразу пабеглі ў банк — там толькі пасмяяліся. З клиенткай гэтай жа фірмы, якая набывала пуцёўку на лячэнне ў санаторый «Сакі» гаварылі сур'ёзна, ветліва. А тэкст быў прыкладна такі: «Мы разумеем, мы спачуваем, мы б з дарагой душой, але валюты ў нас нямашака». Расповед гэтай дамы я чамусьці ўспомніла, калі Прэзідэнт на адной з нарад ушчуваў чыноўнікаў: «Мы ведаем, хто і колькі валюты набраў пад шумок». Чаму ўспомніла, праніклівы чытач няхай здагадаецца сам.

Але нарэшце долар з'явіўся — здавалася б, праблема нейкім чынам вырашаецца. Бо без долара не толькі за мяжу не паедзеш, не купіш сёння кватэру, машыну, дачу, не збярэш патрэбную суму на драбнейшыя набыткі. Гэта ўсім зразумела, і не варта лішні раз абмяркоўваць. Дык вось цікавая рэч заўважана аўтарам на гэтым доларавым дастатку. Так, 21 верасня ранкам, у адным з аддзяленняў банка ў Брэсце долар купілі па 7100 рублёў, прадавалі па 8050. Еўра адпаведна меў нажніцы прыкладна ў паўтары тысячы рублёў. Хіба не цуд? Пры гэтым нам кажуць, што долар стаў падаць. Відаць, банкі так разумеюць рынкавыя адносіны, што розніцу ў курсе можна ўстанаўліваць адвольна. У гэтай сувязі ўспамінаецца выказванне адваката Міхаіла Хадаркоўскага, які задаваў рытарычнае пытанне суду: «Чаму купля нафты па адной цане, а продаж яе па іншай аднаму залічваецца як бізнэс, а другому як крымінал?». Я гэта да таго, што калі ўявіць немагчымае — долар упадзе да адзнакі пяць тысяч, то гэта азначае, хутчэй за ўсё, што купляць яго будуць па пяць, а прадаваць... ніхто не ведае.

Ды ў рэшце рэшт пакінем долар у спакоі, тым больш, што ехаць нікуды не хочацца, калі спатыкнешся з іншым цудам нашага жыцця — адкрыццём візы. Каб адкрыць шэнгенскую візу, напрыклад, у польскім консульстве, патрэбна запрашэнне. Бярэцца да ўвагі нават запрашэнне для шопінгу ў крамах. Але каб яго атрымаць, трэба спачатку паехаць. Паехаць можна, адкрыўшы папярэдне візу. Ёсць, вядома, нейкія абыходныя шляхі. Чула, што знаёмыя бяруць запрашэнні знаёмым, купляюць гэтую паперу нейкім чынам за 20 долараў ці іншую суму. Нашы дыпламатычныя ўстановы дзейнічаюць, відаць, адпаведна. Такім чынам, законапаслухмянаму чалавеку трэба падмануць дзве дзяржавы, каб потым за свае грошы атрымаць жаданую адзнаку ў пашпарце. Вядома, такая працэдура адсейвае многіх ахвотных паехаць. Відаць, на тое і быў разлік, каб менш нас наведвала краіны Еўрасаюза.

А то нядаўна здарыўся канфуз: у адным з супермаркетаў памежнага польскага горада брастаўчане набіралі надта многа харчовых тавараў. І адміністратар магазіна прыняў рашэнне тут жа ўвесці нормы продажу ў адны рукі. Потым пакрыўджаныя пакупнікі паскардзіліся на парушэнне іх правоў. Адміністрацыя гандлёвага пункту выбачалася. Але прэцэдэнт сведчыць яшчэ аб адным цудзе цяперашняга жыцця: тавараў на паліцах нашых крам усё менш і менш, асартымент значна бяднейшы, хоць вытворчасць не скарачаецца.

Звычайна, як іду з працы вечарам, то ні ў адной з малых крамак, якія мне па дарозе, няма ні масла, ні тварагу, а часам і малака з кефірам. Нічога не застаецца, як шыбаваць у супермаркет, але і там выбар невялікі. А раней жа было так зручна.

Прадавачка адной з гэтых крам гаворыць, што тварагу і масла зараз даюць па адной упакоўцы, якія разыходзяцца ў першыя гадзіны. Кобрынскага сыру, які любяць брастаўчане, наогул не паступала за апошні месяц, мотальскіх каўбас больш не возяць, а раней — кожны чацвер.

У чэргах кажуць, што цяпер усё ідзе на Расію. Гэта выгадна вытворцам. Сябе ж можна забяспечваць па астаткавым прынцыпе, як было ў далёкія савецкія часы: свінакомплексы будавалі па ўсёй Брэсцкай вобласці — мяса ў магазінах не бачылі. Але тады ў пару дэфіцыту цэны стаялі на месцы. А цяпер вось цуд: цэны растуць кожны дзень, а дэфіцыт таксама паступова вымалёўваецца. Красамоўнай ілюстрацыяй да сказанага можа быць вітрына кіёска на прыпынку «28 Ліпеня», дзе я штодня чакаю тралейбус. Раней там ад усялякай драбязы вочы разбягаліся. Сёння гляджу: паліцы за шклом спрэс застаўлены пачкамі чаю на адлегласці сантыметраў 15 адзін ад аднаго і, даруйце, штодзённымі пракладкамі айчыннай вытворчасці.

Даўно прапалі з продажу аўсяныя шматкі, якія выпускала прадпрыемства ў Гомельскай вобласці. Свіныя галовы і ногі ў спецыялізаваных крамах мясакамбінатаў разбіраюць пенсіянеры, якія займаюць чаргу загадзя. Можа, у сталічным гандлі справы ідуць лепш, а ў нашай правінцыі на мяжы з Еўрасаюзам вось так.

І самы наш галоўны цуд — цэны. Каб хто сказаў, калі яны нарэшце спыняцца, таму не шкада было б якую-небудзь спецыяльную прэмію прызначыць. Вядома, так супала, але як толькі аб'явілі, што большасці даруслага насельніцтва выплачваецца дапамога на закупку сельгаспрадукцыі, цэны «выстралілі» ў чарговы раз. Асабліва гэта хвалюе сем'і, дзе штодзень трэба карміць дваіх-траіх дзяцей, вучыць іх. Не лепшыя думкі ў гарадскіх адзіноких пенсіянераў, якія павінны са сваёй пенсіі аплачваць камунальныя, лякарствы, а яшчэ ж трэба нешта з'есці. Ды і наогул чалавек, які працуе, павінен мець магчымасць больш-менш прыстойна ўтрымліваць сям'ю. Гэта альфа і амега, на якіх трымаецца любая дзяржава. Калі ж уявіць сёння, напрыклад, сям'ю маладых настаўніка і медсястры, якія маюць дваіх дзяцей і крэдыт за жыллё, у разрэзе сённяшніх цэн, то гэта цуд, калі іх дзеці не галодныя. Гэта азначае толькі адно, што сям'і дапамагаюць бацькі мужа і жонкі. А калі ў каго няма бацькоў, альбо яны па нейкіх прычынах не могуць дапамагчы?

Таму ўлада, чыноўнікі, міністры павінны варушыцца, прыцягваць свежыя маладыя сілы, ствараць нейкі мазгавы цэнтр, з дапамогай якога выдаць праграму выхаду з гэтай сітуацыі і стварыць цуд — найперш утаймаваць цэны. А далей дзейнічаць па праграме.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. БРЕСТЕ

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. Немцевича, 1 № 140100000001026911	ул. Немцевича, 1/1 № 140100000001026912	ул. Наполеона Орды, 1/1 № 140100000001026913	ул. Лирическая, 7 № 140100000001026914	ул. Лирическая, 7/1 № 140100000001026915	ул. Дубровская, 39/1 № 140100000001026916
№ лота	1	2	3	4	5	6
Начальная цена продажи (руб.)*	11 571 793	10 129 115	7 684 156	75 724 114	77 903 673	66 983 964
Начальная цена продажи исходя из кадастровой стоимости (долл. США)	2 271	1 988	1 508	14 860	15 287	13 144
Сумма задатка (руб.)	1 157 000	1 012 000	768 000	7 572 000	7 790 000	6 698 000
Расходы по подготовке. зем.-кадастр. документации, гос. регистрации (руб.)	1 233 912	819 136	827 374	1 199 118	827 374	1 217 484
Общая площадь (га)	0,0762	0,0667	0,0506	0,1216	0,1251	0,1142
Целевое назначение	для строительства и обслуживания жилого дома					
Характеристика ограничений в использовании земли	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	0,0011 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В	ограничений использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. Дубровская, 41/1 № 140100000001026917	р-н индивидуальной застройки «Козловичи» № 334 по ГП № 140100000001026918	р-н индивидуальной застройки «Козловичи» № 335 по ГП № 140100000001026919	р-н индивидуальной застройки «Козловичи» № 336 по ГП № 140100000001026920	ул. Бехтерева, 17 № 140100000001026318
№ лота	7	8	9	10	11**
Начальная цена продажи (руб)*	87 454 545	41 281 167	35 869 215	36 500 610	18 856 525
Начальная цена продажи исходя из кадастровой стоимости (долл. США)	17 161	8 101	7 039	7 163	3 700
Сумма задатка (руб)	8 745 000	4 128 000	3 586 000	3 650 000	1 885 000
Расходы по подготовке. зем.-кадастр. документации, гос. регистрации (руб.)	822 894	1 291 349	913 395	848 291	1 356 560
Общая площадь (га)	0,1491	0,1373	0,1193	0,1214	0,1098
Целевое назначение	для строительства и обслуживания жилого дома				
Характеристика ограничений в использовании земли	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	0,0483 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10кВ; 0,0045 га – охранная зона подземной кабельной линии электропередачи напряжением 10кВ

* – возможна корректировка начальной цены продажи отдельным решением Брестского городского исполнительного комитета исходя из увеличения официального курса доллара США, установленного Национальным банком Республики Беларусь на дату проведения торгов;
** – повторные аукционные торги.

Условия продажи

● осуществить в двухмесячный срок после принятия решения Брестского городского исполнительного комитета о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на него; ● приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); ● по лоту № 11 произвести возмещение затрат на выполнение проектных работ в сумме **1 550 937** рублей и произвести рекультивацию земельного участка с завозом грунта в объеме ориентировочно 1000 куб.м.

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенную копию платежного поручения о внесении задатка; **гражданином –** копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина –** нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. **Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10% от начальной цены объекта перечисляется **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924**.

**Примечания: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность,

Парламенцкі дзённік

Фунт талерантнасці

У сценах беларускага парламента не часта ўбачыш гасцей з Палаты абшчын. Вось чаму нядаўні візіт **брытанскага дэпутата Джона МАНА** знамянальны. Як старшыня міжпартыйнай парламенцкай групы супраць антысемітызму, ён прыехаў у Беларусь з цікавасцю найперш да гэтай праблематыкі. «Каб паглядзець сваімі вачыма, як вырашаюцца тут праблемы з яўрэйскай спадчынай, як захоўваецца памяць аб падзеях Халакосту, — прызнаўся замежны парламентарый журналістам. — Нягледзячы на кароткі візіт, я меў магчымасць сустракацца тут як з афіцыйнымі асобамі, так і з прадстаўнікамі яўрэйскай супольнасці». Брытанскі дэпутат застаўся задаволены ўбачаным. «Яўрэйская супольнасць у Беларусі, хоць і невялікая ў цяперашні час, жыве ў пазітыўнай атмасферы. З'яўляюцца новыя магчымасці ў рэлігійным плане. Праведзена вялікая работа па ўвекавечанні памяці 800 тыс. яўрэяў, якія загінулі тут падчас Халакосту». Яно і не дзіўна: чым-чым, а адсутнасцю талерантнасці Беларусь не папракнеш.

У брытанскага палітыка нельга было не запытацца пра нядаўнія пагромы на яго радзіме, якія атрымалі вялікі рэзананс у сусветнай прэсе. Спадар Ман адзначыў, што менавіта ў яго акрузе пагромшчыкаў не было. Але ён быў вымушаны спыніць свой адпачынак, каб разам з калегамі абмеркаваць сітуацыю: «Мы не хаваліся ад дэбатаў». Ён зрабіў акцэнт на тым, што ў брытанскім парламенце традыцыйна вядуцца шырокія дэбаты. Маўляў, адсутнасцю дыскусійнасці іх нельга папракнуць. «Лепшыя, чым у якой-небудзь іншай краіне», — мяркуе дэпутат. Тыя падзеі, якія адбыліся ў Англіі, на яго думку, цяжка назваць беспарадкамі. А меры, якія прымала брытанская ўлада ў дачыненні да гэтых падзей, ён лічыць адэкватнымі. Уся праблема, паводле яго меркавання, у тым, што стандарты жыцця рабочага класу з-за крызісу пагаршаюцца. «Яго трэба падтрымліваць, усім разам працаваць над гэтай праблемай», —заключае палітык. З вырашэннем эканамічных праблем, маўляў, здымецца і сацыяльнае напружанне.

Паляпшэнню ўзаемаадносін з Вялікабрытаніяй Беларусь надае сур'ёзнае значэнне, паведаміў журналістам **Анатоль ГЛАЗ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ.** У першую чаргу гэта абумоўлена тым месцам, якое займае Вялікабрытанія на сусветнай арэне і яе ўдзелам у вырашэнні міжнародных праблем. Важны складнік двухбаковых адносін — узаемадзеянне паміж парламентамі. У Нацыянальным сходзе рабочыя групы па супрацоўніцтве з парламентам Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі былі ўтворацы ва ўсіх трох скліканнях з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін. У 2000 годзе група сяброўства з Беларуссю была сфарміравана ў брытанскім парламенце, але цяпер яе няма. Для дыялогу неабходна, каб такая група ў парламенце Злучанага каралеўства была адноўлена, мяркуе беларускі дэпутат. Магчыма, нейкі ўнёсак зробіць і гэты візіт брытанскага парламентарыя.

Ала МАЧАЛАВА.

«КАНАВАЛАВУ ПРАШУ ПРЫЗНАЧЫЦЬ СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ, А КАВАЛЁВУ — ПАЖЫЦЦЁВАЕ ЗНЯВОЛЕННЕ»

З такой просьбай учора звярнулася да суда сястра аднаго з загінулых у выніку тэракту ў метро.

Учора ў Доме правасуддзя пачалі апытваць пацярпелых ад тэракту ў метро 11 красавіка 2011 года. Адной з першых да трыбуны запрасілі дзяўчыну, якая страціла ў той дзень 17-гадовага брата.

У момант, калі прадстаўніца загінулага давала паказанні, мы, тыя хто сядзеў ў зале, не мелі магчымасці бачыць яе твару. Але нават па голасе было чутно, што дзяўчына ледзь стрымлівала слёзы. Пра смерць брата яна з маці даведаліся толькі на наступны дзень пасля трагедыі. 11 красавіка доўга тэлефанавалі на яго мабільны тэлефон, але беспаспяхова: ён быў недаступны.

Калі ў дзяўчыны спыталіся, якой меры пакарання, на яе погляд, заслугоўваюць абвінавачваныя, калі іх віна будзе даказана, яна сказала: «Я доўга аб гэтым думала... Канавалаву я прашу прызначыць вышэйшую меру пакарання — смяротнае пакаранне, а Кавалёву — пажыццёвае зняволенне». Маёмасных прэтэнзій сям'я хлопца не заяўляла. «Нам ад іх (абвінавачваных. — **Аўт.**) нічога не патрэбна».

Калі пацярпелыя, якія давалі паказалі, апісвалі падзеі таго трагічнага вечара, па целе, шчыра кажучы, прабягалі мурашкі.

«Мы ехалі з калегам з працы, — расказвае адзін з пацярпелых, якому, паводле яго слоў, «свеціць» група інваліднасці. — Збіраліся выходзіць на станцыі «Кастрычніцкай». Не паспелі выйсці з вагона — адкінула выбуховай хваляй назад. Я ўпаў на падлогу. Было цёмна. На станцыі ляжалі нерухомыя целы, чуліся крыкі. Я ўбачыў мёртвага хлопца ў белай куртцы, які ляжаў ля лаўкі. Як я даведаўся пазней, яму ў сэрца трапіў асколак. Я вынес адтуль трох жанчын, у адной з іх практычна не было рукі: далонь боўталася на сухажыллі... Разам з кімсьці вынеслі мужчыну без ног. Панікі ніякай не было. У вачах чыталася толькі мальба аб дапамозе. Што было пасля таго, як я выйшаў на паверхню, памятаю дрэнна. Самому стала дрэнна...»

«Была вельмі моцная хваля. Людзі пачалі адно на аднаго падаць. Мне падалося, што на мяне рушыцца столь, — падзялілася сваімі ўспамінамі ў судзе пацярпелая, якая ў момант выбуху была ля эскалатара станцыі «Кастрычніцкая». — Людзі дапамагалі адно аднаму ўставаць. Нехта і мне дапамог выйсці на вуліцу.»

Акрамя таго, учора, перад тым, як пачаць апытваць пацярпелых, зачыталі яшчэ некалькі пратаколаў допытаў Дзмітрыя Канавалава, якія праводзіліся ў маі і чэрвені гэтага года. Такім чынам, з'явіліся новыя факты, што датычацца выбухаў у Мінску.

Так, у прыватнасці, 29 чэрвеня Канавалаў заявіў, што Кавалёў ведаў не толькі пра тое, што ён збіраецца ўзарваць метро, але і быў у курсе планаў адносна выбуху ў Мінску ў ноч з 3 на 4 ліпеня 2008 года. «У сярэдзіне чэрвеня 2008 года я яму сказаў, што збіраюся здзейсніць выбух на свята з нагоды Дня Незалежнасці, — прызнаўся Канавалаў следчаму. — Кавалёў мне паверыў і не адгаворваў. Я яго не прасіў дапамагчы мне, не расказваў пра канструкцыю бомбы. Не расказваў і пра тое, што папярэдне ездзіў у Мінск і выбіраў месца выбуху. Мы ў той вечар не пілі. Папрасіў яго не расказваць аб гэтым нікому. Я быў перакананы, што ён нікому не раскажа». «Пасля выбуху я сказаў Уладу (гэта было недзе праз месяц, у пачатку жніўня), што другое прыстасаванне не спрацавала. Гаварылі тады пра выбух недзе хвілін дзесяць. Улад падтрымліваў размову. Я папрасіў, каб ён не расказваў нікому. Улад паабяцаў».

Акрамя таго, на адным з допытаў Канавалаву паказалі здымкі з камер відэаназірання ў метро. Малады чалавек пазнаў сябе на іх і падрабязна апісаў, на якой станцыі ў канкрэтны зафіксаваны момант знаходзіўся і з якой мэтай. «Руку трымаю ў куртцы, каб націснуць на кнопку і прывесці ў дзеянне выбуховае прыстасаванне», — менавіта так Дзмітрый Канавалаў пракаментаваў адзін з кадраў. Пазнаў сябе галоўны абвінавачваны і на здымках камер, устаноўленых на паверхні паблізу ўваходаў на станцыях «Кастрычніцкая» і «Купалаўская». Апошнія былі зроблены 11 красавіка пасля выбуху.

«Ніякіх эмоцый і пачуццяў у мяне не ўзнікала, — так апісаў свой стан пасля выбуху Дзмітрый Канавалаў, адказваючы на допыце на пытанне следчага. — Я выйшаў тады з метро і пешшу дайшоў да здымнай кватэры».

На допыце 13 чэрвеня Канавалаў заявіў следчым, што не краў з часці, дзе праходзіў тэрміновую службу, вогнетушыцелі. «Я знайшоў іх ля гаражнага кааператыва. Гэта проста супадзенне, што менавіта яны зніклі з воінскай часці, дзе я служыў». Пры гэтым пацвердзіў, што першапачаткова планаваў скарыстаць менавіта вогнетушыцелі ў якасці абалонкі выбуховага прыстасавання.

Прывяду яшчэ адзін спрэчны момант справы, агучаны ўчора ў судзе. На стадыі папярэдняга расследавання Дзмітрыю Канавалаву зачыталі паказанні адной яго знаёмай з Віцебска. Дзяўчына падчас допыту заявіла, што была ў падвале дома Канавалава і бачыла там на сценах крыжы, а таксама «вяроўку, на якой можна было павесіцца». Паводле яе слоў, Дзмітрый пастаянна маляваў фашысцкія крыжы. «На паперы, напрыклад, калі мы гулялі ў карты.» «Я ніколі не маляваў фашысцкія крыжы, і яна (знаёмая, паказанні якой зачытвалі. — **Аўт.**) ніколі не была ў падвале», — парыраваў Канавалаў. Праўда, адкуль знаёмая ведае, як выглядае падвал, ён патлумачыць не змог.

Учора ў судзе таксама дала паказанні знаёмая Канавалава Яна, якая з 10 па 12 красавіка бавіла час на здымнай кватэры з абвінавачванымі. У яе паказаннях на стадыі папярэдняга расследавання і ў зале суда пракуроры знайшлі супярэчанні. Так, у судзе Яна сказала, што 10 красавіка не заглядвала за шырму, дзе, па версіі следства, стаяла сумка з бомбай. Раней жа дзяўчына сведчыла аб адваротным. Акрамя таго, у судзе сведка пацвердзіла, што Кавалёў бачыў, што знаходзіцца ў сумцы. Маўляў, калі яна зайшла за шырму, хлопцы там «рыліся» (гэты важкі факт Яна паведаміла следчаму пасля затрымання. — **Аўт.**). Аднак яна сама не паспела заўважыць, што знаходзіцца ў сумцы, бо яе выправадзілі адтуль. Таксама на судзе дзяўчына казала, што 12 красавіка, калі ў дзверы пазванілі (супрацоўнікі міліцыі. — **Аўт.**), Дзмітрый паглядзеў у вочка і адразу забегаў па кватэры. На этапе папярэдняга расследавання Яна давала больш падрабязныя паказанні. Казала, што Канавалаў тады са словамі «Я папаўся» схаваўся ў прыбіральні.

Калі дзяржабвінаваўца Аляксей Стук запытаўся ў сведкі, ці пацвярджае яна паказанні, дадзеныя раней, Яна адказала, што пацвярджае. Маўляў, яна раней памятала лепш усе абставіны.

Надзея ПАЎЛАВА.

«У БЕЛАРУСІ ЗАХАВАЕЦЦА ДЗЕЙНЫ ПЕНСІЙНЫ ПАРОГ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памер страхавых узносаў ва ўсіх пенсійных сістэмах усталёўваецца ў залежнасці ад наяўных абавязацельстваў. У Беларусі ў ліку атрымальнікаў пенсій — 27% насельніцтва (2,5 млн чалавек). Дэмаграфічныя тэндэнцыі такія, што гэтая доля будзе расці. Акрамя таго, абавязковыя ўзносы працадаўцаў і працаўнікоў на дзяржаўнае пенсійнае страхаванне з'яўляюцца адзінай крыніцай фінансавання пенсій. З улікам высокіх абавязацельстваў дзяржавы паніжэнне памеру пенсійных узносаў не ўяўляецца магчымым, падкрэсліла прадстаўнік міністэрства.

Павышэнне пенсійнага ўзросту для жанчын — рэзерв на перспектыву

«Аднак з улікам стабільнай працы пенсійнай сістэмы ў цяперашні час такія змены не актуальныя», — падкрэсліла намеснік міністра. Яна дадала, што пытанне роўнага ўзроставага пенсійнага парога для жанчын і мужчын «у перспектыве будзе разглядацца зыходзячы з эканамічных магчымасцяў і дэмаграфічных змен».

У цэлым у пенсійным заканадаўстве рэвалюцыйных пераўтварэнняў не плануецца, адзначыла начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы міністэрства Таццяна Пагонышава. «Асноўная задача — забяспечыць і ў далейшым бесперабойную працу і прымальны ўзровень выплат, — сказала яна. — Неабходна таксама арыентаваць работнікаў на актыўны ўдзел у дадатковых добраахвотных праграмах пенсійнага страхавання з мэтай дапаўнення дзяржаўных пенсійных гарантый».

Беларуская пенсійная сістэма вельмі шчодрая

«Шчодрасць пенсійнай сістэмы ў тым, што яна прадастаўляе выплаты вельмі рана і вельмі многім, — патлумачыла намеснік міністра. Сёння ў ліку атрымальнікаў пенсій — 27% насельніцтва краіны». Што да памеру беларускай пенсіі на фоне краін СНД у доларавым эквіваленце, то яна знаходзіцца ціпер на чацвёртым месцы (у канцы мінулага года была на другім).

Адказваючы на пытанне рэспандэнта аб атрыманні ў спадчыну адлічэнняў на пенсійнае страхаванне, начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы міністэрства Таццяна Пагонышава адзначыла, што з зарплаты на пенсійнае страхаванне работнік выплачвае толькі 1%, асноўную нагрузку нясе працадаўца. Сродкі, якія паступаюць, накіроўваюцца на фінансаванне бягучых пенсійных выплат. Па гэтых прычынах пенсійныя сродкі не могуць перадавацца ў спадчыну, падкрэсліла спецыяліст.

«Прадастаўленне пенсіі — сведчанне сацыяльнай скіраванасці дзяржавы, — сказала Таццяна Пагонышава. — Агульнапрынята, што дзяржава бярэ на сябе абавязацельства па забеспячэнні неабходных (базавых) патрэб асобам, якія страцілі працаздольнасць. А фарміраванне даходу жаданага ўзроўню, як правіла, забяспечваецца ў рамках удзелу ў праграмах дадатковага добраахвотнага пенсійнага страхавання».

22,4 тыс. чалавек атрымліваюць пенсіі ў памеры ніжэй БПМ пенсіянера

У Беларусі ў верасні колькасць пенсіянераў, якія атрымліваюць пенсіі ў памеры ніжэй бюджэту пражыткавага мінімуму пенсіянера (Br366 тыс. 790), склала 22,4 тыс. чалавек, або 0,9% ад агульнай колькасці пенсіянераў. Пенсіі ў Беларусі ўстанаўліваюцца ў пэўнай залежнасці ад мінулага стажу і заробку, што ўяўляецца цалкам апраўданым, лічыць намеснік міністра.

Адказваючы на пытанне рэспандэнта, які прапаноўвае пры чарговым павышэнні пенсій дадаваць тым, у каго пенсія маленькая, пабольш, а ў каго пенсія вышэй Br1 млн — паменш, Валянціна Каралёва адзначыла, што прапанаваны спосаб індэксацыі пенсій накіраваны на зніжэнне дыферэнцыяцыі памераў пенсій. «Пасля заканчэння вызначанага перыяду гэта прывядзе да таго, што пенсіі, прызначаныя пры невысокім стажы і заробку, стануць вышэйшымі, чым вылічаныя першапачаткова ў максімальных памерах, — сказала намеснік міністра. — Гэта супярэчыць логіцы пабудовы пенсійных сістэм, а таксама меркаванню многіх пенсіянераў і пераважнай большасці работнікаў».

Начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Таццяна Пагонышава праінфармавала, што кошт стажавай адзінкі вызначаецца аб'ёмам пенсійных сродкаў. А ўплыў стажу на памеры пенсій яна праілюстравала на такім прыкладзе: пенсія жанчыны, якая прапрацавала 30 гадоў, на 27% вышэй (пры ўмове аднолькавага каэфіцыента заробку), чым у работніцы са стажам 20 гадоў. А калі стаж складае 40 гадоў, то пенсія будзе вышэй на 36%. Такую розніцу нельга лічыць нязначнай, падкрэсліла прадстаўнік міністэрства.

«З улікам негатыўнага досведу іншых краін, якія змянілі механізм фінансавання пенсій, у Беларусі ўвядзенне назапашвальнага элемента ў агульнай пенсійнай сістэме не плануецца», — адзначыла намеснік міністра.

У Беларусі вывучаецца магчымасць павышэння прывабнасці адтэрміноўкі звароту па пенсію.

БЕЛТА.

ОАО «АВТОТАКСОСЕРВИС»
г. Минск, пр. Жукова, 44
Тел.: (+375 (7) 226-31-80, 226-32-92, 220-63-64
ГАРАНТИЙНОЕ ОБСЛУЖИВАНИЕ А/М ГАЗ
ЭКСПРЕСС-СЕРВИС
СТАНДАРТНЫЕ СЛЕСАРНЫЕ РАБОТЫ
ПРЕДПРОДАЖНАЯ ПОДГОТОВКА
АКТИВНАЯ ПРИЕМКА
МОЙКА
ШИНОМОНТАЖ
ТЮНИНГ И ЛЮКСОВКА
РЕГУЛИРОВКА УГЛОВ УСТАНОВКИ КОЛЕС
АГРЕГАТНЫЙ РЕМОНТ
РЕМОНТ ЭЛЕКТРООБОРУДОВАНИЯ
РЕМОНТ ГБО
ДИАГНОСТИКА
КУЗОВНОЙ ЦЕХ
ПОКРАСОЧНЫЙ ЦЕХ
www.belgaz.by
Сертификат №BY/112 04. 12. 003 08151 от 20.07.2010г. до 20.12.2011г. УНП 100058540

ТРАЛЕЙБУСНАЯ ЭКСКУРСІЯ ПА ГОМЕЛІ ГІСТАРЫЧНЫМ

ПРА Гомель і яго гісторыю раскажа голас дыктара на беларускай мове, калі вам пашчасціць сесці ў «асветніцкі» тралейбус №1 і праехаць ад Гомельскага чыгуначнага вакзала да канцавога прыпынку ў раёне абласной ДАІ. Звонку і знутры сродак перасоўвання афармлены фотаздымкамі і друкаванай інфармацыяй, якая таксама дапамагае лепш зарыентавацца ў падзеях даўно мінулых дзён. Той жа мэце адпавядаюць і кветачкі, на якіх з аднаго боку — выява помніка першаму гамяльчаніну, з другога — кароткая даведка аб цікавым факце. Напрыклад, аб такім: «Магчыма, назва горада Гомель — бярэ свой пачатак ад паўночнакаўказскага і іранскага слова «гом», што азначае «ўзвышша», «груд» або «яр».



Старшыня Гомельскага гарвыканкама Віктар ПІЛІПЕЦ, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, галоўны інспектар па Гомельскай вобласці Ігар ПРАКАПЕНКА і старшыня Камітэта дзяржкантроля Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЯКАБСОН едуць у гістарычным тралейбусе.

Між тым, як расказаў намеснік дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» Сяргей Лазько, аўтарамі ідэі сталі студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Сухога на чале з Аляксандрам Аплачынавым. Маладыя людзі звярнуліся ў Гомельскі гарвыканкам, дзе іх ідэя знайшла падтрымку і працяг. Далей усе працавалі разам. Да ўвасаблення ў жыццё былі прыцягнуты і спецыялісты музея Гомеля, і дызайнеры, і мясцовыя журналісты.

Гэты транспартны сродак прайшоў адным з першых па месце, які пасля рэканструкцыі быў адкрыты ў Гомелі. А першымі пасажырамі сталі кіраўнікі вобласці і горада. Для ўдзелу ў значнай падзеі прыехаў і старшыня Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон. Гэта па яго ініцыятыве, калі ён быў старшынёй Гомельскага аблвыканкама, пачаліся работы па аднаўленні гэтай важнай транспартнай артэрыі цераз раку Сож.

Такім чынам, можна лічыць, закончана сумесная аперацыя, якая пазбавіла горад над Сожам ад аўтамабільных пробак паміж Цэнтральным, Савецкім і Навабеліцкім раёнамі Гомеля. Гэта першы падвоены мост не толькі ў Гомелі, але і нагогул цераз раку Сож. Два гады таму побач са старым 60-гадовым вырас браблізнец. Пры яго ўзвядзенні выкарыстоўвалі новыя маркі сталі і бетону, апоры на палях, забітых на 30-метровую глыбіню, а пралётнае палатно-«бутэрброд», складзенае са мноства пластоў, вытрымлівае нераўнамерныя нагрузкі. Па такой жа схеме капітальна рэканструявалі і суседні мостпенсіянер. **Дзмітрый АЛАМПІЁЎ, дырэктар філіяла Мостабудаўнічага ўпраўлення №4,** кажа, што ад старога маста мала што ўвогуле засталося:

— Жалезабетонныя збудаванні мы цалкам разабралі, нарасцілі апоры і ўстанавілі новыя сучасныя жалезабетонныя бэлькі. Тэрміны будаўніцтва былі скарочаны на 5 месяцаў, выдаткі склалі 25 млрд рублёў.

Падвоены мост мае даўжыню амаль 350 метраў. На кожнай з яго галін ціпер аднабаковы рух. Гэта важны крок у барацьбе з гарадскімі пробкамі. Больш за тое, гэта яшчэ і аб'ект міжнароднага значэння. Па ім толькі за летні сезон праязджае больш за мільён турыстаў з Беларусі, Расіі і Украіны. У бліжэйшых планах будаўнікоў — узвядзенне яшчэ аднаго моста цераз Сож. Ён будзе знаходзіцца за некалькі кіламетраў вышэй па цячэнні. Новая аб'язная траса звяжа напрамак Пецярбург—Адэса і Мінск—Бранск.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ГОРАД, ПРЫЯЗНЫ ДЗЕЦЯМ

У Гродзенскім гарвыканкаме падпісаны мемарандум аб далучэнні абласнога цэнтра да глабальнай ініцыятывы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) «Горад, прыязны дзецям».

Гэты праект (яго каардынатарам у Беларусі з'яўляецца Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі) садзейнічае стварэнню гарманічных умоў для жыцця і развіцця асобы дзіцяці, а таксама для рэалізацыі правоў і інтарэсаў дзяцей. Пры гэтым укараняецца сістэма незалежнага маніторынгу. Ініцыятыва Дзіцячага фонду ААН ужо падтрымана ў Барысаве, Брэсце, Гомелі, Добрушы, Лідзе, Наваполацку, Пінску, Пружанах, Светлагорску. А цяпер, разам з горадам над Нёманам, да праекта далучаюцца Мінск і Шклоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Уважаемые акционеры
Открытого акционерного общества
«Белорусский народный банк»
Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «БНБ-Банк» (далее – Собрание) проводится в очной форме 24 октября 2011 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 87а

Повестка дня Собрания:
1. Об избрании членов Совета директоров ОАО «БНБ-Банк» кумулятивным голосованием.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «БНБ-Банк».
3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата формирования реестра владельцев акций ОАО «БНБ-Банк» для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 10 октября 2011 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, будет производиться с 9.00 до 10.00 по месту проведения Собрания при предъявлении ими документов, удостоверяющих личность (представителями акционеров – также документов, подтверждающих полномочия на участие в Собрании).

Лица, имеющие право на участие в Собрании, могут ознакомиться с информацией, относящейся к вопросам, включенным в повестку дня Собрания по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 87а, комн. 26 с 17 октября 2011 года в рабочие дни с 9.00 до 17.00, перерыв с 12.30 до 13.15.

Телефон для справок: (8 017) 280 16 63.
www.bnb.by
УНП 100513485

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже единым лотом имущества, принадлежащего ООО «Стройкровля», расположенного по адресу: г. Брест, ул. Л-та Рябцева, 44.

В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование и характеристики продаваемого имущества
1	Капитальное строение – хранилище (инв. № 100/С-1683). Общая площадь – 645,4 м².
2	Покрытие асфальтобетонное, 356,5 м²
3	Покрытие асфальтобетонное, 42 м²
4	Покрытие гравийное,965 м²
5	Забор – ж/б панели, 162 м²
6	Забор металлический, 216 м²
7	Ворота въездные, 14 м²

Имущество, входящее в состав лота , расположено на земельном участке 3248 м², кадастровый номер 140100000001021551.

Начальная цена – 212 600 000 белорусских рублей без учета НДС.

Аукцион состоится в **12.00 25 октября 2011г.** по адресу: г. Брест, ул. Л-та Рябцева, 29А, оф. 203.

Продавец имущества – ООО «Стройкровля». Организатор аукциона – управляющий ООО «Стройкровля» Бахуревич Е.В., тел. (8 029) 3608384.

Заявления на участие в аукционе принимаются организатором аукциона **по 24 октября 2011 г.** по адресу: г. Гродно-25, а/я 13.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества должен быть зачислен на расчетный счет ООО «Стройкровля» 3012126970014 в Региональной Дирекции № 400 ОАО «БПС-Банк», код 369, УНП 590001553.

Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов стоимости реализуемого с аукциона имущества. Победителем признается участник, предложивший наивысшую цену. С победителем аукциона в течение 7 календарных дней заключается договор купли-продажи недвижимого имущества.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в срок, указанный в договоре купли-продажи, по согласованию с продавцом.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

ЧАС МОРКВЫ

Фермер Галіна ІВАНОВА: «Цыбуля сёлета — самая выгадная культура».

І не толькі морквы, але бульбы, цыбулі, капусты — усяго таго, што вырасла сёлета на беларускіх палетках. У сельскай гаспадарцы заканчваецца ўборка ўраджаю, прыйшоў час рабіць запасы на зіму. На традыцыйных восеньскіх кірмашах сяляне прапануюць сваю прадукцыю: а цэны нават ніжэйшыя за мінулагоднія!

ВЯСЁЛЫ ДЗІЦЯЧЫ ЎРАДЖАЙ

На полі паблізу вёскі Сідаравічы Магілёўскага раёна — пыл, сонца і ярка-аранжавая морква. Там грымяць трактары і снуюць маленькія фігуркі з вёдрамі. Сваю працу на бураковым полі толькі што скончылі дзеці з Сідаравіцкай школы, а цяпер вучні з суседняй, Усходаўскай школы прыехалі дапамагчы з морквай мясцоваму фермеру Галіне Івановай.

Дзецям весела: яны нічога не маюць супраць палявых работ, асабліва калі тыя даюць магчымасць адарвацца ў цёплае і сонечнае «бабіна лета» ад заняткаў у класных пакоях. Бадзёрыя школьнікі радасна пазіруюць з морквай. Актуальная прыкмета такая: поўныя вёдры моркві — гэта да ўдачы.

— Цяпер гарачая пара для сельскай гаспадаркі, а мы з задавальненнем прыйшлі на дапамогу, — гаворыць **намеснік дырэктара па выхаваўчай працы Усходаўскай сярэдняй школы Галіна ФІЛІМОНАВА.** — Фермер дае магчымасць не толькі дзецям зарабіць грошы, але і дадаткова пастаўляе прадукцыю для школьнай сталоўкі, а значыць, робіць больш танным школьнае харчаванне.

Дзеці працуюць на полі толькі з дазволу бацькоў, пасля інструктажу па тэхніцы бяспекі, пад кіраўніцтвам і з дапамогай настаўнікаў, да абеду — з перапынкамі на адпачынак і асабліва смачнае ў палявых умовах сняданне.

— Школьнікі могуць зарабіць да 10 тысяч рублёў у дзень, і яны гэта ведаюць — працуюць добрасумленна, шчыруюць, — кажа Галіна. — Ды і ўвогуле гэтая праца ў задавальненне: прыемна працаваць, бо ўраджай добры і морква прыгожая!

— На беларускай зямлі ўсё добра расце, — упэўнена **фермер Галіна Іванаўна ІВАНОВА.** — Нездарма я заўсёды чую ад людзей, што наша прадукцыя — самая салодкая, самая сакавітая, самая смачная.

СЕЛЬСКАЯ ПРАЦАЎНІЦА Ў РУЖОВЫМ

Фермеры — вядома ж, вялікія працаўнікі. Яны звычайна маюць крыху стомлены і нават суровы выгляд, які падкрэслівае звычайна цёмнае практычнае адзенне. На полі ў Сідаравічах фермер Галіна Іванова з'явілася ў ружовым: модны світар і фартух у ружовых колерах, светлыя штаны, пляжныя шлёпанцы.

— І так жыццё бывае сумным, а калі ў чорнае апранацца — зусім дрэнна будзе, — смяецца Галіна Іванаўна. — Нам трэба бадзёрыцца.

Гэтай жанчыне — 61 год. Свой зайздросны загар, які пасуе да светлых валасоў, яна атрымала не на пляжы, а на палях. Яе фермерская гаспадарка «Іванава» разам з падобнай сынавай у Магілёўскім і Быхаўскім раёнах мае супольна 150 гектараў зямлі, на якой расце розная гародніна: бульба, буракі, цыбуля, морква, перац, агуркі, таматы.

— Я заўсёды смяюся, што баюся памерці, бо на тым свеце можа і не быць работы! — смяецца яна.

Калісьці Галіна Іванаўна працавала ў сельскай гаспадарцы галоўным аграномам, а потым, ад 1992 года, падалася на свой хлеб. Можа, ён больш салодкі?

— І той быў несалодкі, і гэты таксама. Цяпер увогуле самы складаны час, калі раніцай прачынаешся і не ведаеш, што на колькі падаражэла, і звычайна — апроч тваёй сацыяльна значнай прадукцыі. У сельскай гаспадарцы нялёгкая праца. А вось морква сёлета вырасла салодкая: цукар нават вышэй за норму, а нітратаў — амаль нуль. Мы сеем галандскія гатункі, каб гародніна добра захоўвалася. Гэта эканамічна чыстая і смачная прадукцыя!

Сімвалы дабрабыту: на фоне фермерскага дома перабіраюць бульбу.

Галіна Іванаўна вельмі задаволена дапамогай школьнікаў і ласкава называе іх «працавітымі чарвячкамі». Аплату за працу фермер па заканчэнні работ пералічыць аддзелу адукацыі, ды яшчэ адпусціць школе па 2 кілаграмы бульбы і 2 кілаграмы гародніны на кожнага працаўніка за дзень.

— Гэта для мяне вельмі выгаднае супрацоўніцтва, — радуецца Іванова. — Што б я без школьнікаў рабіла? Тут у нас мала вольных работнікаў: у Сідаравічах ёсць праца, а людзей нестае.

ГІГАНЦКАЯ ЦЫБУЛЯ АТАКУЕ

Галіна Іванаўна прызнаецца, што апошнім часам уначы не спіць: пільнуе свае палі, адкуль таямнічым чынам за ноч можа знікнуць, напрыклад, тона прадукцыі. Жанчына скардзіцца, што з крадзяжамі проста немагчыма справіцца.

Новы сімвал сялянскага дабрабыту: насупраць поля будуецца фермерскі дом — з вялікім балконам, каб зручней пільнаваць ураджай. На пярэднім плане работнікі перабіраюць бульбу, і ўсю гэтую кампанію, у сваю чаргу, пільнуе (а насамрэч соладка спіць) гаспадарскі сабака. Побач — шмат гуртоў з цыбуляй, накрытых сенам.

Вялікую ўвагу сёлета надаюць якраз цыбулі, таму што яна аказалася найбольш выгаднай культурай. **Кошт на цыбулю** трымаецца на ўзроўні **2600 рублёў за кілаграм,** на рынках яе прадаюць па 3 тысячы.

— Паглядзіце, якая ў нас вырасла вялізная цыбуля — гэта спецыяльны гатунак «Эксібішн», — хваліцца Іванова. — Такая цыбуля — салодкая, для салаты. Праўда, доўга не захоўваецца.

У гаспадарцы Івановых сёлета вырасла 200 тон цыбулі і больш за 300 тон бульбы — гэта вельмі добры ўраджай. Але сховішчаў для яго недастаткова. Таму фермер з Сідаравічаў, як і іншыя сельгасвытворцы, імкнецца прадаць вырашчанае цяпер.

— Трэба хутчэй рэалізоўваць прадукцыю, таму, як правіла, фермеры прапануюць кошт працэнтаў на 10 ніжэй, чым буйныя сельскія гаспадаркі, — тлумачыць Галіна Іванаўна.

Разам з тым, сёлетнія сезонныя цэны фермеру не падабаюцца, таму што нізкія, на погляд аграрыяў.

— **Кошт на бульбу сёлета** ніжэй за мінулагодні: летась мы прадавалі яе за 1,5-2 тысячы за кілаграм, а сёлета — **1100 рублёў**, — называе яна актуальныя цэны. — Моркву і буракі прадаём за 1300 рублёў, але і тут цэны падаюць. Будзем браць аб'ёмамі!

ПАКУЛЬ ЦЭНЫ ШЭПЧУЦЬ

Прычынай сёлетняга падзення цэн на гародніну і караняплоды Галіна Іванова называе ўраджайны год. Цэны цяпер яшчэ больш нізкія, таму што на рынак выйшлі са сваёй прадукцыяй і буйныя вытворцы.

Сельскія гаспадаркі, фермеры і прыватнікі імкнуцца цяпер на кірмашы, дзе гараджане, заклапочаныя сваёй харчовай бяспекай, набываюць прадукцыю ў запас на халодны сезон.

— Я думаю, што галадаць гараджанам дакладна не выпадае! — усміхаецца Галіна Іванова. — Пытанне толькі ў цане: калі хочаце набыць што-небудзь больш таннае, то трэба ісці на кірмашы альбо непасрэдна да вытворцаў.

У гэтую суботу, 24 верасня, у Магілёве адбудзецца чарговы сельскі кірмаш, з вялікага шэрагу запланаваных. На пляцоўку каля абласнога Палаца культуры запрашаюцца гандлёвыя арганізацыі і сельскагаспадарчыя вытворцы. Асартымент шырокі: садавіна, гародніна, бульба, малочная і мясная прадукцыя, рыба.

— Цэны ніжэйшыя, чым звычайныя рыначныя, — запэўнівае **начальнік управлення гандлю і паслуг Магілёўскага гарвыканкама Ігар ЖУРУН.** — Мы рабілі аналіз: калі свініна на рынку не менш чым 50 тысяч за кілаграм, а ў сярэднім — 60-65 тысяч, то **на кірмашы — ад 36 да 48 тысяч за кілаграм.**

Цэны на гародніну, садавіну і караняплоды вагаюцца значна: тут важныя суадносіны якасць—цана. У рэшце рэшт, у пакупніка ёсць выбар.

— Галоўнае ўсё ж такі для нас — гэта бульба, — гаворыць Ігар Журун. — А **самы нізкі кошт за кіла

Факт

МІЁРЫ ПРЫВАБНЫЯ ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

У Міёрах прайшоў раённы інвестыцыйны форум. Сярод іншых былі прадстаўлены і турыстычныя праекты. Дарэчы, у развіццё турызму ўжо ўкладваюць грошы замежныя бізнэсмены.

— З удзелам расійскага капіталу распачынаецца будаўніцтва турыстычнага цэнтра, — адзначыў старшыня Міёрскага райвыканкама Ігар Кузняцоў. — Інвестыцыі дасягаюць узроўню чатырох мільёнаў еўра. Праект будзе рэалізоўвацца на працягу некалькіх бліжэйшых гадоў.

На форуме адбылася і прэзентацыя прадукцыі ад мясцовых вытворцаў. Міёрскі хлеб, каўбасы і іншае карыстаюцца вялікім попытам далёка па-за межамі раёна. Вытворцы, каб развівацца, зацікаўлены ў інвестыцыях.

Таксама ў Міёрах прайшоў рэгіянальны этап рэспубліканскага свята нацыянальных культур. Прадстаўнікі каля трыццаці нацыянальнасцяў пражываюць на Віцебшчыне, і іх культура і традыцыі былі прадстаўлены ў глыбінцы Прыдзвінскага краю. У Міёрах ужо шосты раз сабраліся прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў з самых розных куточкаў Віцебшчыны — сёлета каля трохсот чалавек. Удзельнікі свята запрашалі на «раённыя падворкі», дзе былі прадстаўлены нацыянальныя кухні. Яўрэйскія, татарскія, башкірскія, украінскія прысмакі былі на любы густ. Падчас культурнай праграмы на канцэртнай пляцоўцы самадзейныя артысты выступілі ў самых розных жанрах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАТРЫМАНЫ «МАСЛАМАН»

Побач з вёскай Пералессе Маларыцкага раёна міліцыянеры праверылі аўтамабіль жыхара вёскі Лукава гэтага ж раёна.

У салоне знойдзена 525 пачкаў сметанковага масла і больш за 10000 пачкаў цыгарэт беларускай вытворчасці. Вядома, дакументаў на тавар у непрацуючага вяскоўца не знайшлося. А да мяжы з Украінай ад названых вёсак — лічаныя кіламетры. Таму тавар на суму больш за 35 мільёнаў рублёў канфіскавалі. Цяпер слова за судом.

«ПАЛЯВАННЕ» НА САБАК

У Белаазёрску завёўся злодзей са сваёй «спецыфікай»: крадзе толькі паляўнічых сабак.

Аб прапажы сабак ўжо заявілі трое мясцовых жыхароў. Цікава, што ўсе гэтыя сабакі знаходзіліся ў вальерах аднаго з гаражных кааператываў. Ва ўсіх выпадках зламыснік дзейнічаў аднолькава: ён зрываў навясны замок з вальера і забіраў сабаку.

Яна СВЕТАВА.

ЦЯГНУЦЬ РЫБАВОДЫ, ЦЯГНУЦЬ СТАРОННІЯ...

Рыбгасы краіны пачалі масавы аблоў сажалак з рыбай. І ў гэтай справе ў іх з'явіліся нечаканыя «памочнікі».

Так, за крадзеж 24 кілаграмаў рыбы дзяржінспектары затрымалі двух рыбаводаў ААТ «Доследны рыбгас «Лахва». 19 кілаграмаў прадукцыі спрабаваў скрасці з сажалкі свайго прадпрыемства і рыбавод ААТ «Рыбгас «Альба». Пяць рыбаводаў ААТ «Рыбгас «Волма» ўвогуле не сталі разменьвацца на дробязі і паспрабавалі ўкрасці каля 100 кілаграмаў рыбы. Акрамя таго дзяржінспектары, аглядаючы прылеглую да нагульнай сажалкі тэрыторыю, знайшлі яшчэ 135 кілаграмаў безгаспадарчай рыбы. Уся «здабыча» была вернутая на склад рыбгаса. На сажалках ААТ «Сялец» «адзначыўся» таксама непрацуючы грамадзянін, у якога канфіскавана 23 кілаграмы рыбы. У ААТ «Рыбгас «Чырвоная Зорка» дзяржінспектары затрымалі супрацоўніка Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» — кіроўцу і ляснічага. У машыне, на якой яны ехалі, было знойдзена каля 60 кілаграмаў карпа. На сажалцы ААТ «Рыбгас «Трэмля» работнік СВК «Зара» і непрацуючы грамадзянін з дапамогай сеткі вылавілі каля 30 кілаграмаў карпа, пакуль іх не «схапілі за руку» дзяржінспектары. Гэта звесткі толькі за некалькі дзён. Увогуле за адзін тыдзень дзяржінспектарамі зафіксаваныя 33 выпадкі крадзяжу сажалкавай рыбы. Рыбгасам за гэты тэрмін было вернута звыш 530 кілаграмаў скрадзенай прадукцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗЛОДЗЕЙ СХАВАЎСЯ НА ГАРЫШЧЫ

18 верасня ў доме на завулку Алімпійскі ў Асіповічах спрацавала сістэма ахоўна-пажарнай сігналізацыі. На месца выехала група затрымання. А калі міліцыянеры ўбачылі ў акне дома адкрытую фортачку і выстаўленае ў ёй шкло, то да іх далучылася і другая група затрымання. Бо сумненняў ужо не было: унутр пралез «госць».

На настойлівыя просьбы супрацоўнікаў аховы добраахвотна выйсці чалавек не адгукнуўся, і міліцыянеры пайшлі ў дом. Падстрахоўваючы адзін аднаго, яны агледзелі пакоі, але нікога там не знайшлі. Тады міліцыянер-кінолаг звярнуў увагу, што сабака Берта трывожна сябе паводзіць каля лесвіцы на гарышча. Наверсе, пасярод старых рэчаў, і схаваўся 42-гадовы мужчына, жыхар горада Міёры, раней судзімы, які нідзе не працуе.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні Дэпартамента аховы, маёмасць, што злодзей хацеў скрасці, не пацярпела, а ён сам перададзены следча-аператыўнай групе Асіповіцкага РАУС.

Ілона ІВАНОВА.

ПЕРШЫ КОНКУРС ДЗІЦЯЧАЙ ВЫСОКАЙ МОДЫ

У Наваполацку сёння вечарам стартуе першы адкрыты конкурс дзіцячай высокай моды «Kids Couture».

Сярод заяўленых удзельнікаў конкурсу прадстаўнікі не толькі Віцебшчыны, але таксама з Гомеля, Мінска. Конкурс адбудзецца ў гарадскім Палацы культуры. Арганізатары ўпэўнены, што праект стане вітком у развіцці дзіцячай мадэльнай творчасці, будзе спрыяць адраджэнню добрых традыцый айчыннай моды, з улікам рэалій нашага часу.

Сярод членаў журы будуць прафесіяналы ў галіне дызайну і сцэнічнага мастацтва, а таксама прадстаўнікі прадпрыемстваў і фірмаў — вытворцаў дзіцячага і падлеткавага адзення. Конкурс правядуць у намінацыі «Дзіцячая творчасць», маладыя дызайнеры заявілі калекцыі ў намінацыі «Майстар-дызайн дзіцячага і падлеткавага адзення».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Футбал

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па футзале Сяргей САФОНАЎ:

«УСЕ ХАТНІЯ МІЖНАРОДНЫЯ ТУРНІРЫ МЫ АБАВЯЗАНЫ ВЫЙГРАВАЦЬ»

У маі наступнага года Беларусь прыме чэмпіянат Еўропы

НАЛЕТА ў Беларусь пройдзе чэмпіянат Еўропы па футзале. Як рыхтуецца беларуская федэрацыя футзала да гэтага міжнароднага турніру і як удалося нам яго атрымаць, а таксама на што можа разлічваць наша зборная і чаму менавіта Беларусь апошнім часам разглядаецца як плацдарм развіцця ўсяго еўрапейскага футзала, мы гутарым з першым намеснікам беларускай федэрацыі, галоўным трэнерам нацыянальных каманд Сяргеем Сафонавым.

— Вось ужо амаль год Сяргей Буйноўскі, кіраўнік Дэпартамента аховы МУС, узначальвае федэрацыю футзала, якая праз год адзначыць дваццацігоддзе. За гэтыя амаль дваццаць гадоў мы дасягнулі вялікіх вынікаў — спартыўных і арганізацыйных. А ў апошні год змаглі рэалізаваць шэраг задумак, якія раней ажыццявіць не ўдавалася. Акрамя таго, што правялі чэмпіянат і кубак краіны, нам удалося арганізаваць і некалькі міжнародных турніраў, у межах якіх мы прымалі і кіраўніцтва еўрапейскага саюза футзала на чале з прэзідэнтам Валерыем Ахумянам — у студзені, напярэдадні чэмпіянату свету ў Калумбіі ў нас праходзіў еўрапейскі кангрэс. Дарэчы, у мінулыя выхадныя прэзідэнт еўрапейскага саюза таксама знаходзіўся ў Беларусі, на Кубку Еўропы «50+».

З прыходам новага кіраўніка федэрацыі Беларусь разглядаецца еўрапейскім саюзам футзала як асноўны плацдарм развіцця гэтага віду спорту ў Еўропе. У нас ёсць вопыт правядзення вялікіх міжнародных спаборніцтваў — чэмпіянат Еўропы-2004, Кубак УЕФС у 2006-м, Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў, у студзені гэтага года мы правялі Кубак «Белая Русь». Акрамя таго, пачынаючы з гэтага года мы будзем праводзіць адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футзале з удзелам лепшых каманд Расіі. Сёлета на ўдзел у ім падалі заяўкі тры расійскія клубы: чэмпіён Расіі-2010, яраслаўскі «Падводнік», маскоўскія «Спартак» і «Пятроўскі замак». Першыя два калектывы — наймацнейшыя каманды Еўропы, уладальнікі кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў двух апошніх розыгрышаў.

— Як вы лічыце, што прыцягвае іх ў Беларусь?

— Мяркую, найперш — наша прадуманая да дробязяў арганізацыя, узровень правядзення, у тым ліку ўзровень гульні нашых каманд, сур'ёзная спартыўная база (мы выкарыстоўваем самыя лепшыя спартыўныя збудаванні — брэсцкую «Вікторыю», магілёўскі «Алімпіец», Гомельскі палац гульнявых відаў спорту, сталічны комплекс «Дынама»). Цікавасць да нашых турніраў праяўляюць і прыбалты, і ўкраінцы. Гэты сезон стартуе ў канцы кастрычніка — у Гомелі пройдзе першы тур Адкрытага чэмпіянату, а з лістапада-снежня пачнецца Кубак Беларусі. Магчыма, з часам мы зможам махнёмся на правядзенне ўсходнееўрапейскай лігі футзала з прыцягненнем заходніх каманд — з Чэхіі, Славакіі, Польшчы.

Акрамя таго, з прыходам у федэрацыю Сяргея Буйноўскага мы змаглі рэалізаваць праект Універсіяды сумесна з міністэрствам адукацыі, якія праводзіць Цэнтр моладзі і студэнтаў. Летась у ім удзельнічала 26 мужчынскіх каманд з 26-ці ВНУ. Сёлета ўжо заявілася 32 каманды, плюс — жаночыя спаборніцтвы з удзелам 8-10 каманд.

— У Беларусі футзал яшчэ непрафесійны від спорту. Хто ім займаецца?

— Пакуль футзал можна назваць паўпрафесійным. Выдаткі на спаборніцтвы не вельмі значныя, і гэта дазваляе гуляць самым розным структурам, у тым ліку не самым багатым. Гэта і ВНУ (у чэмпіянаце выступаў і Віцебскі дзяржаўны педінстытут, і Палескі дзяржаўны ўніверсітэт), прадпрыемствы («Белкамунмаш», «Гомельскі вагонарамонтны завод», «Гарадзейскі цукровы завод»), а таксама каманды Дэпартамента аховы і Дзяржаўнага мытнага камітэта. Ёсць каманды, якія прадстаўляюць камерцыйныя структуры. Удзел самых розных каманд магчымы таму, што футзал — дэмакратычны від спорту.

— Як фарміруецца нацыянальная зборная?

— З лепшых гульцоў клубаў, як і ва ўсіх гульнявых відах спорту. Я рыхтую нацыянальную зборную з 1993-га. У 2004-м яна стала чэмпіёнам Еўропы, шмат разоў была прызёрам. Апошні раз яна становілася бронзавым прызёрам у 2008-м у Бельгіі. Летась на еўрапейскім першынстве мы занялі чацвёртае месца, прайграўшы ў серыі пасляматчавых пенальці чэхам.

— Зборная на 30 адсоткаў складаецца з гульцоў каманды Дэпартамента аховы МУС Беларусі...

— Гэта сапраўды так. У зборнай 12-14 гульцоў, і адна чацвёрка — гульцы каманды Дэпартамента аховы. Сёлета на чэмпіянаце свету ў Калумбіі ў камандзе была чацвёрка з гульцоў названай каманды, а таксама адзін з вартаўроў.

— Як заахвочваюцца гульцы нацыянальнай зборнай?

— Гэтае пытанне хвалюе не толькі прэсу, але і саміх гульцоў. Нядаўна мы распрацавалі палажэнне, згодна з якім зможам заахвочваць гульцоў нацыянальнай каманды ў выніку паспяховага выступлення.

— Чацвёртае месца на чэмпіянаце Еўропы лічыцца паспяховым?

— Не. Бо стаяла задача быць на п'едэстале. А вось калі мы сёлета сталі пятай камандай на чэмпіянаце свету ў Калумбіі, гэта быў сур'ёзны вынік. Наперад мы прапусцілі толькі былых чэмпіёнаў свету і Еўропы. Усе першыя тры месцы занялі лацінаамерыканцы, якія гуляюць у футзал, толькі паспеўшы нарадзіцца. Расія стала чацвёртай, мы — пятымі. Турнір праходзіў у складаных умовах: высакагор'е, нам не хапала кіслароду, не паспелі прайсці аклімацыю. Гуляць было складана. Але мы прайгралі толькі два матчы — калумбійцам, якія сталі чэмпіёнамі свету, і парагвайцам, якія былі на той момант чэмпіёнамі. І тое толькі з-за агіднага суддзейства.

— У чым сакрэт поспеху нашай зборнай і беларускага футзала?

— У нас вялікі вопыт развіцця гэтага віду спорту, выступленняў на міжнароднай арэне. Акрамя таго, развіццё футзала падтрымліваюць многія дзяржаўныя структуры, напрыклад, кіраўніцтва міністэрстваў юстыцыі, адукацыі, МУС, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Нацыянальны алімпійскі камітэт, МЗС і, безумоўна, міністэрства спорту і яго абласныя ўпраўленні, а таксама кіраўніцтва рэгіёнаў. У нас і сапраўды шмат адметных клубных вынікаў, а не толькі поспехі нацыянальнай каманды. Каманда Дэпартамента аховы двойчы запар станавілася прызёрам Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў і Кубка УЕФС. Гэта адна з самых вопытных каманд.

— Сакрэт яе поспеху, напэўна, і ў асаблівай дысцыплінаванасці гульцоў...

— Адназначна, гэта яе «канёк». Парадак, дысцыпліна, як правіла, б'е клас.

— Зусім нядаўна Беларусь прымала Кубак Еўропы «50+». Што ўяўляе гэты турнір?

— Гэта новыя спаборніцтвы, якія еўрапейскі саюз футзала праводзіць у другі раз. Летась ён праходзіў у Расіі, наша каманда не вельмі добра выступіла, заняла пятае месца. Сёлета еўрапейскі саюз прапанаваў правесці гэты турнір нам, і Беларуская федэрацыя вырашыла зрабіць унёсак у развіццё ветэранскага футзала. Турнір прайшоў у Лагойску. Арганізацыяй, парадкам, чысцінёй задаволены ўсе каманды, і таму яны з захапленнем пацвярджаюць свае намеры прыязджаць у Беларусь зноў. Турнір унікальны тым, што людзі дарослыя, у якіх склалася кар'ера, працягваюць падтрымліваць сябе ў форме, гуляючы ў футзал.

— Чаму вы так пільна сачылі за гульнямі турніру?

— Я сам як гулец (бо мне таксама 50+) выступаў за адну з каманд — «Еўрасцяг Лагойск». Наша каманда, дарэчы, найменш прафесійная з усіх прадстаўленых. Там гуляюць мае сябры, якія са мной па жыцці: я запрасіў іх паўдзельнічаць, і яны пагадзіліся. І мы атрымліваем задавальненне ад кантактавання і ад футбола.

— У маі Беларусь прыме чэмпіянат Еўропы. У якім горадзе ён будзе праходзіць?

— Літаральна на днях было вызначана, што ён пройдзе 13-20 мая ў спартыўным комплексе «Вікторыя» ў Брэсце. Гэтыя тэрміны нам зацвердзіў прэзідэнт еўрапейскага саюза футзала.

— Як Беларусі ўдалося атрымаць права правядзення такога значнага міжнароднага турніру?

— Гэтае права мы атрымалі год таму, на кангрэсе ў Бельгіі. Я там прысутнічаў і сам быў прыемна здзіўлены, што падчас абмеркавання кандыдатуры Беларусі ўсе еўрапейскія краіны прагаласавалі «за». Еўропа ведае, што мы ўмеем арганізоўваць такія турніры, што ў нас спартыўная краіна. І правядзенне папярэдніх спаборніцтваў запэўніла Еўропу, што да нас можна ехаць.

— Да нас прыедзе 11 каманд, беларуская зборная будзе 12-й. Як выглядае расстаноўка сіл на гэтым хатнім для нас турніры?

— Усё, што праводзіцца ў Беларусі, мы павінны выйграваць. Задача стаіць — паказаць максімальны вынік. Асноўнымі супернікамі будуць, як заўсёды, Расія, Бельгія, Чэхія, Каталонія, Францыя. Але больш за ўсё прэтэндаваць на золата будзе Расія, Бельгія, Чэхія. І мы, безумоўна.

Гутарыла
Алена АЎЧЫННІКАВА.

У суботу, 17 верасня, заўчасна пайшоў з жыцця выканаўчы дырэктар мінскага гарадскога аддзялення грамадскай арганізацыі «Беларуская федэрацыя футзала» Уладзімір Цімафеевіч Дрыга. Кіраўніцтва федэрацыі глыбока смуткуе і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім памерлага.

Утерянный аттестат № 148868, выданный Минским ГПТУ № 24 строителей им. Н.А. Кедышко, и свидетельство об общем базовом образовании за № 0447052 на имя Солушко Виталия Александровича **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42 61 62

Продавец: Открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», Витебская обл., Оршанский р-н, г.п. Копысь, ул. Октябрьская, 80, тел. (0216) 27 66 89

№ лота	Наименование объекта, краткая характеристика	Начальная цена (бел.руб.) без учета НДС	Сумма задатка (бел.руб.)
1	Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-19429, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Калинина, д. 32/1, общая площадь – 1098,7 кв.м, наименование – здание цеха по производству жидкого стекла, назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание цеха по производству жидкого стекла с асфальтным покрытием, кабельной линией электропередач, водопроводом чугунным. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000001005355, площадью 0,4780 га, по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Калинина, д. 32, назначение – для обслуживания здания цеха жидкого стекла.	178 744 649	17 874 460
2	Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-29485, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Калинина, д. 32, общая площадь – 419,4 кв.м, наименование – здание цеха по производству краски, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание цеха по производству краски с асфальтным покрытием, кабельной линией электропередач. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000001005354, площадью 0,3525 га, по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Калинина, д. 32, назначение – для обслуживания здания цеха по производству краски.	76 144 782	7 614 470

Аукцион состоится 31.10.2011 г. в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов – 28.10.2011 г. до 17.30. Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы.

2. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность. При подаче документов предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (претендент на покупку) подписывает протокол о результатах аукциона в день проведения аукциона.

4. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения, доводится до сведения участников до начала аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) уплачивает НДС от цены продажи.

6. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан заключить договор купли-продажи не позднее 20 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить предмет аукциона согласно сроков, указанных в договоре купли-продажи.

7. Реквизиты для перечисления задатка: р/счет № 3012218220012 в головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 150801701, УНП 390477566.

8. Организатор торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения торгов.

9. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42 61 61, (029) 514 36 47, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by, www.gki.gov.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

Продавец: ликвидируемое по решению собственника (собрания акционеров) Торгово-производственное закрытое акционерное общество «Полярис», г. Витебск, проспект Строителей,15, (0212)221880.

Организатор аукциона: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8(0212) 42 61 62, 8(0212) 42 60 07; 8(029) 510 07 63.

№ лота	Наименование объекта, краткая характеристика	Начальная цена без учета НДС (бел. руб.)	Сумма задатка
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-102365 площадью 3 880,7 кв.м, назначение – торговое помещение, наименование – торговый центр, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, проспект Строителей, д. 15. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-102377 площадью 8 078,9 кв.м, назначение – помещение транспортного назначения, наименование – многоуровневая автостоянка, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, пр-т Строителей, д. 15. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-66800, расположенное по адресу: Витебская область, г. Витебск, проспект Строителей,15, протяженность 507,2 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование — ливневая канализация, очистные. 2853/5000 долей капитального строения с инвентарным номером 200/С-66794, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть, протяженность 208,4 м. 91/125 долей капитального строения с инвентарным номером 200/С-66799, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть, протяженность 167,6 м. Видеоконтрольное устройство автостоянки (инв. № 000063). Видеонаблюдение торгового центра (инв. № 000028). Автоматизированная система дымоудаления (инв. № 000080). Объекты расположены по адресу: Витебская область, г. Витебск, проспект Строителей, 15 на земельном участке с кадастровым номером 240100000003001548, площадью 0,5583 га, предоставленном на праве постоянного пользования ТП ЗАО «Полярис».	16 636 459 000	1 663 645 900
2	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-44972 площадью 638,0 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание складских помещений магазина № 10 «Стройматериалы». Капитальное строение, наименование – проходная, площадь – 21 кв.м (одноэтажное, кирпичное, инв. № 419). Навес; асфальтобетонное покрытие; ограждение железобетонное; ограждение железобетонное с металлической сеткой; ограждение – металлическая сетка; ворота металлические; ограждение кирпичное; уборная. Объекты расположены по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. 39-й Армии на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000410, площадью 0,2754 га, предоставленном на праве постоянного пользования ТП ЗАО «Полярис».	650 400 000	65 040 000

Торги состоятся **18 октября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления для участия в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5. Окончательный срок подачи документов **17 октября 2011 года до 17.30.**

Для участия в торгах приглашаются юридические, физические лица и индивидуальные предприниматели, имеющие право принимать участие в торгах.

1. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы, дать подписку о том, что у него нет препятствий для приобретения имущества, предоставить заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заверенные в установленном порядке копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации – для юридических лиц, заверенную в установленном порядке копию свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей, доверенность представителя юридического лица, письменное решение соответствующего органа управления, разрешающее приобретение имущества, если это необходимо в соответствии с учредительными документами участника, физическим лицам – паспорт, представителям физических лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

2. Сумма задатка перечисляется на р/с Организатора аукциона № 3012218220012 в Головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, МФО 701, УНП 390477566. Сумма задатка, внесенная лицом, приобретшим имущество с торгов, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов предварительно внесенные ими суммы возвращаются в течение пяти рабочих дней после окончания торгов.

3. Победителем торгов будет признано лицо, предложившее самую высокую цену.

4. Победитель торгов обязан оплатить стоимость объекта в течение семи рабочих дней после окончания торгов.

5. Победитель аукциона обязан оплатить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, затраты по оценке имущества в порядке и сроки, указанные в протоколе аукциона.

6. НДС в размере 20% от цены лота оплачивается Победителем аукциона сверх цены приобретенного лота.

7. Окончательное решение о праве на земельный участок принимается местными органами власти.

8. Дополнительную информацию можно получить по тел.: 8(0212) 42 61 62, 8(0212)42 60 07, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

КАЛИНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛАСТЬ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность негосударственным юридическим лицам, индивидуальным предпринимателям и гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных двухэтажных жилых домов.

Лот № 1. Земельный участок по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Братьев Ясковец, 12, для строительства и обслуживания одноквартирного двухэтажного жилого дома. Площадь участка 0,1040 га, кадастровый номер 322350100003004116. Начальная цена продажи 12 275 120 белорусских рублей. Ограничений в использовании нет. Около земельного участка проходят инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 619 402 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников). Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3604419002150, ЦБУ № 313 филиала 317 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Мозырь, код 678, УНН 400061401.

Лот № 2. Земельный участок по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Братьев Ясковец, 3, для строительства и обслуживания одноквартирного двухэтажного жилого дома. Площадь участка 0,1251 га, кадастровый номер 322350100003004115. Начальная цена продажи 14 765 553 белорусских рубля. Ограничение на площади 0,0177 га в связи с охранной зоной линии электропередач напряжением 10 кВ. Около земельного участка проходят инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 620 984 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников). Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3604419002150, ЦБУ № 313 филиала 317 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Мозырь, код 678, УНН 400061401.

Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Возможность ознакомиться с земельными участками предоставляется продавцом в срок до 20 октября 2011 года.

Аукцион состоится **26.10.2011 года в 10.00** по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, пл. Ленина, 1 (райисполком).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения **до 17.30 20 октября 2011** года по адресу: г. Калинковичи, ул. Князева, 4, кабинет 218 (землеустроительная служба Калинковичского районного исполнительного комитета).

Контактные телефоны: 8 (02345) 33 855, 32 600.

СООБЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА
ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает:

Лот № 2: Земельный участок с кадастровым номером 221880419301000013, площадью 0,2498 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стололиценский с/с, д. Стырики, 10Б для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания, опубликованный в информационном сообщении о проведении открытого аукциона в газете «Звязда» от 02.09.2011 г. № 167 (27031), снимается с торгов.

Приносим свои извинения. Контактный тел: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье» (продавец) извещает о проведении 26 октября 2011 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Здание старого холодильника площадью 268,0 кв.м (инв. № 330/С-8158) с асфальтным покрытием площадью 174,0 кв.м	г. Мозырь, ул. Ветровая, 21	78 854 496	7 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», ул. Ветровая, 21, 247760, г. Мозырь.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 24 октября 2011 г. включительно.** При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.07.2011 г.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье»): р/с № 3012203350014 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Мозырь МФО 151501945, УНП 400082468, ОКПО 01568553.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте: gomeloblreklama.by

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье» (продавец) извещает о проведении 26 октября 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименоание	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Встроенное торговое помещение магазина № 37 с инвентарным номером 330/D-2334, площадью 74,5 кв.м.	г. Мозырь, ул. Студенческая, 50	96 000 000	9 600 000
2	Пристройка к административному зданию (диспетчерская) и бытовые помещения с инвентарным номером 330/С-8156, площадью 73,3 кв.м.	г. Мозырь, ул. Ветровая, 21Е/1	93 686 040	9 300 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», ул. Ветровая, 21, 247760, г. Мозырь.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Опл

Этнаскарбонка

ПА СВЯТЫХ СЛЯДАХ

Частка другая: Каменныя сакрэты

У Беларусі шмат незвычайных камянёў, якія шыюць, лечаць, распавядаюць. Зразумела, у легендах.

Ішла Божая Маці

Некалі Бог раззлаваўся, што людзі не выконваюць запаведзі і вырашыў іх знішчыць, каб нарадзіліся новыя, бязгрэшныя. У пакаранне на людзей ён наслаў патоп. Але няшчасных пашкадавала Божая Маці. Спусцілася з неба, і таму, што ўсюды была вада, ішла па камянях, што тырчалі з вады. Там, дзе яна ступала, засталіся сляды. Такое паданне захавалася ў *вёсцы Канюхі Бераставіцкага раёна*. Але пра легенды, звязаныя з адбіткамі на камянях, распавядаюць па ўсёй Беларусі. Прычым часам на камені слядок можа быць не адзін. Так, даследчыкі з этнагістарычнага цэнтра «Явар» у Камянецкім раёне на камені, што ляжыць пасярод поля, побач з больш вялікім следам пабачылі маленькі — згодна з паданнем, тут быццам бы Маці Божая была з немаўляткам. Ёсць на камені і маленькая дзірачка — след ад кіёчка. Паданне распавядае, што ў спякотны дзень жняцы вельмі хацелі піць і ніяк не маглі знайсці крыніцу. Раптам заўважылі жанчыну з дзіцём, якая сказала, што не трэба шукаць, бо недалёка ёсць крынічка. І потым жанчына знікла.

Іншае паданне ўзгадвае Маці Божую, якая спускалася на зямлю, блукала, у балацінцы выпэцкалася і пачала прасіць Бога, каб дапамог ёй знайсці крынічку. А як памылася, стала на камень, адштурхнулася і паляцела. У апошнім паданні, між іншым, Маці Божая вельмі прыбліжаная для чалавека, бо таксама мае патрэбу ў дапамозе.

А вось валун у *вёсцы Сянежыцы Навагрудскага раёна* захаваў сляды і Багародзіцы, і чорта, які за ёй гнаўся. Прычым шматлікія паломнікі, што ў розныя часы ішлі да гэтага каменя, след Багародзіцы цалавалі, а ў след чорта плявалі. Дарэчы, да каменя ходзяць і зараз.

Такіх камянёў на Беларусі шмат. Ходзяць да іх людзі яшчэ з дахрысціянскіх часоў. І таму камяні сведчаць не толькі пра багатую фантазію нашых продкаў, але распавядаюць і пра яго духоўную культуру. Прычым, як адзначалі замежныя даследчыкі, якія вывучалі культуру і традыцыі Беларусі ў XIX-XX стагоддзях, менавіта ў нашай краіне найбольш захавалася старажытная «інфармацыя». І хто ведае, можа, калі яе прааналізаваць і расшыфраваць, удасца не толькі даведацца пра светапогляд нашых продкаў, але і зразумець хто мы, беларусы, такія, у чым наша адметнасць.

Пакаранні

Дзіва, што культ камянёў не знік з прыходам хрысціянства, не змаглі з ім «разабрацца» і савецкія ўлады. Калі было забаронена хадзіць да камянёў, людзі ішлі да іх уначы, маліліся. Праўда, за савецкім часам шмат камянёў было знішчана: іх разбівалі ці ўзрывалі, спіхвалі ў канавы і рэкі.

І гэта нягледзячы на тое, што людзі верылі, што такія камяні нельга чапаць, ссоўваць з месца, класці ў падмурак дома. Можа, невыпадкова з'явіліся легенды пра тое, што дом, у падмурак якога паклалі такі камень, пакрыўся цвіллю і гніллю (рэч у тым, што камень звязаны з вільгаццю, даволі часта побач з каменем знаходзіцца крыніца). Тым, хто ссоўваў камяні з месца, уначы з'яўляліся розныя здані, прывіды, якія прасілі вярнуць усё на месца.

Да камянёў хадзілі нават дочкі магнатаў ВКЛ, каб папрасіць сабе жаніхоў. Між іншым, даводзілася чуць расповеды, што і ў наш час такія камяні дапамагаюць людзям знайсці сабе пару. Людзі ходзяць да іх лячыцца, у іх просяць дапамогі жанчыны, якія не могуць зацяжарыць. Такая просьба падмацоўваецца ахвяраваннямі: на камяні кладуць цукеркі, хлеб, грошы. У *Дзятлаўскім раёне каля вёскі Горка* ляжыць вялікая камлыга. У ёй — расколіна, праз якую трэба прапаўзці тры разы, каб пазбавіцца ад хвароб. Паданне распавядае, што раней праход пад каменем быў значна большым: тут нават можна было праехаць на кані. Між іншым, гэта адзін з нямногіх камянёў, куды людзі ходзяць са святаром. Царква прызнала культы святых крыніц, а культы камянёў многія царкоўныя служкі не падтрымліваюць.

Між іншым многія культавыя камяні і ў наш час захоўваюцца ў храмах. Часам кропельніцы, якія ўжо сталі непатрэбнымі, можна сустрэць ля храмаў. Бывае, што старажытным сведкам гісторыі знаходзіцца і якое-небудзь новае прымяненне: напрыклад, у іх саджаюць кветкі.

На Беларусі шмат па-данняў пра тое, што камяні некалі былі жывымі істотамі. Людзі і жывёлы ператвараліся ў камень у пакаранне за працу на Вялікдзень.

— Вялікдзень — вялікае хрысціянскае свята. Але я думаю, што некалі ў гэты час адзначалася і паганскае свята, бо адгэтуль пачынаўся новы год, лічылася, што зямля прачынаецца і яе нельга чапаць. Відаць, былі і паганскія абрады, пасля якіх дазвалялася пачынаць працу на зямлі, — разважае даследчыца традыцыйнай спадчыны беларусаў, журналіст, **публіцыст Ірына КЛІМКОВІЧ**.

У камень ператвараліся араты і яго валы, а часам і жонка. Так, *у вярхоўях Вілii* ляжыць камень Сцяпан. Паводле падання, аднойчы селянін араў на Вялікдзень, жонка прынесла яму ў поле абед, пачала сварыцца і ў сэрцах выпаліла: «Каб ты каменем стаў». Яе муж скамянеў, а жанчына ператварылася ў сасну, якую сталі зваць Куліна.

Легенды асуджаюць і сквапнасць. Так, быццам Бог у выглядзе жабрака прыходзіць у вёску, просіцца на начлег. Але людзі ўсё трапляюцца яму нядобразычлівыя. Толькі бедная жанчына пускае ў свой дом і дзеліцца апошнім. Жабрак загадвае жанчыне ісці за ім і не азірацца. Але тая, чуючы шум і крыкі людзей, азіраецца — і ў той жа момант ператвараецца ў камень. На месцы ж вёскі з'яўляецца возера.

Вам не здаецца, што ў легендах зашыфраваны менталітэт народа? А можа, гэта было і павучанне для падрастаючых пакаленняў?

У паданнях паказваецца і стаўленне да багацця. Даволі часта багатыя людзі з'яўляюцца ў іх аб'ектам асуджэння. Лічыцца, што іх багацце здабыта нячыстым шляхам. Невыпадкова існуюць паданні пра тое, што скарбы, якія быццам бы схаваны пад камянямі, зачараваныя, і таму чалавеку, які іх знойдзе, шчасця не будзе.

Многія камяні, якія знаходзяцца ў нізінных месцах, ля балацін, лічацца чортавымі. Кажуць, уначы ля такога каменя можа з'явіцца чорт, які будзе вадзіць чалавека. Часам чорт прымае выгляд паніча і людзей, што позна вяртаюцца з гулянкі, заклікае гуляць у карты. Прычым небаракі могуць загуляцца да таго, што прайграюць вопратку. А калі ўжо даходзіць да гульні на душу, то ад вялікага граху іх выратоўвае спеў пеўнікаў...

Хто жыве ў камені?

Сёння вядома пра некалькі тысяч камянёў, але інфармацыя сабрана пра больш чым паўтысячы. І звесткі працягваюць назапашвацца. Так, паводле сабранай у экспедыцыях інфармацыі, у выдавецтве «Беларуская навука» выйшла кніга «Культавыя і гістарычныя валуны Беларусі», аўтары якой А. Карабанаў, В. Вінакураў, Л. Дучыц, І. Клімковіч. Прычым з яе можна даведацца пра камяні як геалагічную з'яву, так і пра легенды, звязаныя з рознымі камянямі: следавікамі, акамянелымі істотамі, шаўцамі, чортавымі і г.д.

Магчыма, кніга спатрэбіцца экскурсаводам і гаспадарам сядзіб, пісьменнікам, рэжысёрам. Нядрэнна было б, каб старыя легенды знайшлі ўвасабленне ў кінафільмах і мультфільмах. Прычым сюжэты тут такія, што любы стваральнік фэнтэзі пазайздросціў бы беларусам — нашчадкам такой творчай спадчыны.

Чаго толькі вартыя камяні-шаўцы, камяні-краўцы! Як вам такі сюжэт? Адно з такіх паданняў звязана з каменем у *вёсцы Гогалеўка Чашніцкага раёна*. Людзі верылі, што ў камені жыў змей, які быў краўцом. Часам змей ператвараўся ў прыгожага хлопца і лётаў цераз возера на спатканне да пастушкі. Аднойчы ён стаміўся, паклаў дзяўчыне галаву на калені і папрасіў, каб яна пабудзіла яго, калі на небе з'явіцца хмара. Але дзяўчына не пабудзіла змея (па адной з версій яна закімарыла, па другой — нібыта хлопец ёй надакучыў). Кравец прачнуўся, калі пачалася навальніца. Раззлаваны, ён ударыў каханую па шчацэ і кінуўся ўцякаць да свайго каменя. Але пярун забіў змея. Пачалася вялікая залева. Каб спыніць дождж, трэба было закапаць змея, але як яго ні закопвалі, ён усё аказваўся на паверхні і зноў пачыналася залева. І так было, пакуль не ўзгадалі, што зямлі на магілу змея павінны нанасіць малыя дзеці (паводле іншай версіі, трэба было запрэгчы ў лапаць пеўніка). Гэты камень і сёння шануецца. Некаторыя жыхары сцвярджаюць, што быў нават фотаздымак змея, калі ён ператвараўся ў хлопца. Наколькі ж вераць у гэтую старажытную легенду, што ўяўляюць, быццам усё адбывалася зусім нядаўна!

Кажуць, што калі да камянёў-шаўцоў прыкласці вуха, можна чуць грук швейнай машынкі альбо малатка. Камяням нельга загадваць, бо тады яны могуць прышыць рукавы не там, дзе трэба, ці наогул перастаць шыць. Вось толькі адзенне або боты, якія шыюць камяні, можна апранаць на ігрышчы, у карчму, але толькі не ў храм, бо там усё распаўзецца на кавалкі. Можа, у такіх паданнях адбілася сутыкненне хрысціянскай рэлігіі і паганскіх вераванняў? Усё ж ігрышчы, карагоды, нейкія інсцэніроўкі — гэта элементы старажытных абрадаў.

Можна ўзгадаць яшчэ і пра камяні са знакамі, надпісамі, малюнкамі, з паглыбленнямі, ямкамі, а таксама каляровыя камяні ці камяні, звязаныя з пэўным бажаством (Перуном, Дажджбогам) або гістарычнай асобай. Можна стварыць адпаведныя турыстычныя маршруты. Але ёсць яшчэ і святыя крыніцы, дрэвы, горы, азёры! Мы нават не здагадваемся, у якім зачараваным краі жывём! Якое тут багацце назваў, паданняў! Цікава: колькі сакрэтаў яшчэ захоўвае неспазнаная Беларусь?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота аўтара.

Новыя маркі

28 верасня 2011 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Рэспублікі Беларусь і Ісламскай Рэспублікі Іран». Мастацкае афармленне Яўгена Сіманенкі.

СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



На фота БЕЛТА: алімпійскі чэмпіён Андрэй АРАМНАЎ

П	А	А	Б	Р	А	В	О	У	Л	Л
А	Р	Т	О	Ж	Н	З	Д	Г	Г	Е
С	Т	Д	А	Ы	Л	А	Л	Е	А	Н
К	А	Ж	Р	Э	А	У	З	Т	А	Д
А	В	Ы	Т	К	К	Б	Р	О	Л	Ь
П	І	І	А	Р	Л	А	К	Ў	К	Е
Л	С	Н	Ы	Т	Я	Н	Д	М	А	Р
Ю	Б	С	Т	У	Т	Э	А	А	М	А
З	І	Н	А	П	А	С	П	Р	О	Л
Н	І	К	Л	К	Р	К	А	Д	Н	Ы
М	А	Ч	А	А	С	Т	А	К	А	Г

ЛАБІРЫНТ. Гэтым разам у лабірынце адшукайце загаданыя словы. Літары ў словах-адказах сплятаюцца па гарызанталях — злева направа і справа налева, па вертыкалях — зверху ўніз і знізу ўверх, але не дыяганалях. Колькасць літар у адказах пазначана ў дужках. Адно слова ў якасці прыкладу ўжо прыведзена.

Такім чынам: **1.** Свежая галінка, сцябло расліны (8). **2.** Малады парастак расліны (8). **3.** Упрыгажэнне вышэй кісці рукі (9). **4.** Адбіццё гуку; рэха (8). **5.** Вясняр і спявак у Венецыі (9). **6.** Даўней: хатні настаўнік (8). **7.** Від выяўленчага мастацтва (7). **8.** Шматгадовая лекавая расліна (8). **9.** Вышэйшая навучальная ўстанова (8). **10.** Расклад спартыўных спаборніцтваў (8). **11.** Нагаворнае зелле (8). **12.** Інструмент швачкі (9). **13.** Каша з кукурузных круп (8). **14.** Лазневая прылада (7). **15.** Спартыўная шабля (8).

У свеце жывёл

ЗА ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ МІНЧАНЕ ЗАПЛАЦІЛІ ПАДАТАК ЗА ВАЛОДАННЕ САБАКАМІ Ў ПАМЕРЫ ЗВЫШ 800 МЛН РУБЛЁЎ

За першае паўгоддзе мінчане заплацілі падатак за валоданне сабакамі ў памеры 813 млн 746 тыс. рублёў (за адпаведны леташні перыяд — 422 млн 901 тыс. рублёў). Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведамілі ў ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».

У параўнанні з мінулым годам падатковыя стаўкі падраслі. Згодна з рашэннем Мінгарсавета, сёлета прыняты наступныя стаўкі: пры вышыні сабакі ў карку да 40 см — 0,4 базавай велічыні ў месяц (было 0,15); ад 40 да 70 см — 1 базавая велічыня (было 0,5); 70 см і больш — 1,2 базавай велічыні (было 0,7).

Самым вялікім падаткам — 1,5 базавай велічыні штомесяц (было 1,3) — абкладаюцца ўладальнікі сабак патэнцыйна небяспечных парод. Такіх налічваецца 40 (пералік зацвярджаны пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ад 12 снежня 2001 года № 40).

Рашэннем Мінгарсавета ўстаноўлена, што сродкі, атрыманыя ў выглядзе падатку за валоданне сабакамі, накіроўваюцца: 65% — на пакрыццё выдаткаў, звязаных з адловам і ўтрыманнем бадзяжных жывёл; 35% — на будаўніцтва пункта прыёму і часовага ўтрымання жывёл.

У жыллёвых службах Мінска зарэгістравана 12 211 сабак.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

ТАЙГА ПЕРАЕХАЛА Ў ГРОДНА

У Гродзенскім заапарку прынялі адразу чацвярых новых гадаванцаў, якія пераехалі да нас з Расіі.

Двое гімалайскіх медзведзянят і маладая самка кенгуру Бенэта дагэтуль пражывалі ў Ніжнім Ноўгарадзе, а гадавалая тыгрыца Тайга перабралася да нас з Пензенскага заапарка.

Дарэчы, у нядзелю, 18 верасня, у горадзе над Нёманам адбудзецца свята «Дзень нараджэння заапарка». У праграме — канцэрт, гульні і конкурсы, святочны торт, а таксама ўрачыстае адкрыццё «Дома малпаў».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

І СТАЛА ЗУБРАНЯ БАЙТАМ

У адным з вальераў Белавежскай пушчы на пачатку лета нарадзілася зубраня. Адміністрацыя Нацыянальнага парка аб'явіла тады інтэрнэт-конкурс на лепшую мянушку малому. Наведвальнікі сайта даслалі каля трохсот варыянтаў. З іх журы адабрала дзясятак і зноў прапанавала выбраць лепшы. Большасцю галасоў зубрынае дзіцяня назвалі Байтам. На камп'ютарнай мове гэта азначае адзінку вымярэння лічбавай інфармацыі. А пераможцамі конкурсу сталі мінчанін Антон Давыдкін і жыхар Харкава Гарык Манукян — абодва яны прапанавалі назваць жывёліну Байтам.

Яна СВЕТАВА.

НА АДНУ АВЕЧКУ БОЛЬШ

Камерунскія авечкі, якія з'явіліся ў віцебскім заапарку летам, абзавяліся нашчадкам. Вядома, маленькае ягня спачатку карміла мама, але з-за адсутнасці ў яе дастатковай колькасці малака пра маленькую авечку поўнасцю цяпер клапоцяцца работнікі заапарка. Сухое малако, растворанае ў вадзе, замяняе мацярынскае.

Як назіраюць у заапарку, немаўля вельмі актыўнае, не любіць сядзець у клетцы (а ў яе свае «апартаменты» — у асобным памяшканні клетка ля батарэі) і ўсё спрабуе вырвацца на волю. Тым часам на ўскраіне Віцебска будуецца новы заапарк — самы вялікі па плошчы ў нашай краіне. Камерунскіх авечак, ільва, ваўкоў, ліс, малпаў і іншых жывёл чакае наваселле.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ну і ну!

Унукі абакралі дзеда

83-гадовага жыхара вёскі Ворані абакралі родныя ўнукі.

Двое непрацуючых дзецюкоў, якім пад трыццаць, сарвалі навясны замок у падсобнае памяшканне і выцягнулі 10 мяхоў бульбы і каля 300 кілаграмаў агародніны, якія пенсіянер прыпас на зіму. Калі зладзеяў затрымалі, то забралі ў іх частку ўкрадзенага ўраджаю — тую частку, якую яны не паспелі прадаць.

Яна СВЕТАВА.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Па гарызанталі: Атанат. Шуфлят. Рэшта. Отт. Нуга. Рапс. Піла. Эрас. Алеп. Каюр. Стаціна. Сани. Кана. Ядаваб. Баві. Явар. Іжыца. Лаха. Ушчынак. Ост. Аці-лак. **Па вертыкалі:** Ватрак. Вясло. Вахта. Сэр. Сава. Лава. Тарантас. Ру. Стан. Шпанга. Віц. Анал. Кажу. Бяно. Ліс. Акын. Пацец. Піца. Торт. Арда. Акучнік. У. **Лабірынт:** 1. Парастак. 2. Атожылак. 3. Вранэзлет. 4. Волдуліс. 5. Ганадырец. 6. Дарэктар. 7. Жывапіс. 8. Зубоўка. 9. Інстынкт. 10. Канапаар. 11. Лобізнік. 12. Напастак. 13. Мамалыга. 14. Мачаўка. 15. Эспадрон.

Сёння

Месяц

Апошняя квадра 20 верасня. Месяц у сузор'і Льва.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.56	19.07	12.11
Віцебск —	6.45	18.57	12.12
Магілёў —	6.46	18.57	12.11
Гомель —	6.43	18.53	12.10
Гродна —	7.11	19.22	12.11
Брэст —	7.12	19.23	12.11

Імяніны

Пр. *Андрэя, Васіля, Глеба, Івана, Канстанціна, Мікалая, Паўла, Пятра, Яўгена.*

К. *Тэклі, Багуслава.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

23 верасня

1922 год — Сталін прадставіў праект «аўтанамізацыі» савецкіх рэспублік, што азначала паглынанне іх РСФСР (план быў адхілены Леніным).

1848 год — на свет з'явіўся прадукт, які ў савецкія часы ў нас не выпрабляўся і лічыўся вульгарным спараджэннем Захаду, а сёння шырока і назойліва рэкламуецца на тэлебачанні і ў іншых сродках масавай інфармацыі, як выдатны сродак асвяжыць дыханне і прадухіліць з'яўленне карыесу. Гаворка, вядома ж, ідзе пра жавальную гумку. Першы яе ўзор быў выраблены менавіта 23 верасня 1848 года ў хатніх умовах амерыканцам Джонам Курцісам. Праўда, ён аказаўся не дастаткова прадпрымальны, таму першы патэнт на вытворчасць жавальнай гумкі атрымаў нейкі Уільям Фінлі Семпл са штата Агаё. У патэнце ад 28 снежня 1869 года было туманна напісана: «Камбінацыя каўчуку з іншымі кампанентамі ў любых прапорцыях...». Праз дзесяць гадоў — у 1880 годзе — іншы амерыканец, аптэкар Джон Колган, шляхам доўгіх эксперыментаў дамогся таго, каб водар і густ жавальнай гумкі заставаліся надоўга. Пасля гэтага сярод вытворцаў пачалася сапраўдная гонка за сківіцамі пакупнікоў. Асаблівай папулярнасцю яны карысталіся падчас сухога закону. Бармэны падпольных піцейных устаноў выдавалі іх наведвальнікам, каб перабіць пах спіртнога... У 1939 годзе на свет з'явілася праца амерыканскага прафесара Холінгворта, які пераканаўча даказваў, што пастаяннае жаванне здымае мышачнае напружанне і стрэс. З тых часоў жавальная гумка стала абавязковым кампанентам у пайцы амерыканскіх салдат.



Цытата дня:

«Асаблівае мастацтва — ведаць, на што не варта звяртаць увагі. І чым больш доўжыцца гутарка, тым такое мастацтва больш неабходнае».

Сэмюэл Батлер (1835—1902), англійскі пісьменнік.

МОЖА І АДПОМСЦІЦЬ...

У славянскай міфалогіі бусел звязаны з богам маланкі і грому — Перуном. Ствараецца ўражанне, што гэтая птушка знаходзілася пад своеасаблівай аховай галоўнага бога славянскага пантэона: «Дзе бусел гняздзіцца, там перуны не б'юць і град не падае».

● У 1977 годзе жыхар в. Вялікі Рожын Салігорскага раёна Мікалай Коўчын (1910 г.н.), а потым і жыхарка з в.Чудзін Ганцавіцкага раёна Марыя Цалагус (1909 г.н.) расказалі нам пра тое, што буслы маглі прадказваць, ці будзе ўраджайным год. Калі бусел выкідваў са свайго гнязда яйка, лічылася, што год будзе неўраджайным, калі ж ён выкідваў з гнязда бусляня, то гэта прадказвала вельмі нешчаслівы год.

● У вёсцы Згурск Чэрвеньскага раёна доўгі час жылі дзве пары буслоў. Аднойчы адна з іх так і не прыляцела ў сваё гняздо. У той год памёр гаспадар хаты, каля якой калісьці сяліліся буслы.

● Паводле вераванняў нашых продкаў, калі вясной бусліная сям'я не вярталася ў сваё гняздо, то гэта прадказвала няшчасці: паморак, пажар, паводку або яшчэ якую бяду, якая магла здарыцца або ў гэтай хаце, або ў вёсцы.

● Традыцыі стасункаў з райскай птушкай прадуледжвала не толькі максімальнае спрыянне буслінай сям'і, але і забарону чапаць (разбураць) яго гняздо: «Дрэва, на якім бусел гняздо сваё сцеле, нельга сячы, бо гэта можа выклікаць няшчасце ў гаспадарцы».

● Шанавалі бусла як карыснае стварэнне, якое нішчыць жаб, змей і вужоў. Але буслоў таксама баяліся, калі яны праляталі паблізу вясковых сяліб, бо верылі, што яны могуць распаліць пажар, кінуўшы на дах хаты запаленую галавешку або нават уторкнуўшы яе пад страху.

● Лічылася, што буслы вельмі помслівыя. Яны могуць нарабіць вялікую шкоду тым, хто парушыў буслінае гняздо. Аднойчы за тое, што гаспадар знішчыў буслінае гняздо, адна з птушак прынесла і паклала на комін вялікі кавалак шкла. Як толькі запальвалі ў печы, увесь дым «валіў» на хату.

● Забіць бусла лічылася страшным грахом. Чалавека, які гэта зрабіў, маглі напаткаць самыя неверагодныя непрыемнасці.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Аб'ява.
Аддам 40 кілаграмаў кабачкоў у моцныя рукі.

☺

Буфет ва ўніверсітэце.
Студэнт:
— А слойка ўчарашняя?
Буфетчыца:
— Падагрэеш — будзе сённяшняя.

☺

Я замуж не хачу, бо ў мяне прыгожае фота ў пашпарце.

☺

— Няўдалы дзень сёння. Люська з-за нейкай дробязі скандал закаціла. А я так разлаваўся, што запярэчыў ёй.
— Ну ты, гэта... Ты мужык! :)

☺

Цікава, аб чым думаюць аматары гульні «гарадкі», гледзячы на Стоўнхендж?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 41 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 4592 Нумар падпісаны ў 19.30 22 верасня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12